

ЛЕТНІЯ НЕБЯСПЕКІ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Сямейная газета

КАЛІ ВАШ СПАКОЙ ПАРУШАНЫ...



Сямейная газета

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

30 МАЯ 2024 г. ЧАЦВЕР № 104 (30238)

**КОРАТКА**

- **Узровень харчовай бяспекі ў Беларусі дасягае 95 працэнтаў.**
- Мінпрацы: для атрымання сацыяльных выплат праз банк неабавязкова наяўнасць банкаўскай карткі.
- **Савет па развіцці прадпрымальніцтва збярэ прапановы бізнесу па рэгуляванні работы маркетплэйсаў.**
- **Урад зацвердзіў комплекс мер па падрыхтоўцы да ацяпляльнага сезона.**
- Дзяржаўтаінспекцыя Мінска ўзмоцніць кантроль за аўтамабілямі таксі.
- **Дзень адчыненых дзвярэй 1 чэрвеня пройдзе на кінастудыі «Беларусьфільм» .**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей АЛЕЙНІК, міністр замежных спраў Беларусі:**

*«Шэраг нашых контрпартнёраў адмовіліся ад прынцыпаў нармальнасці і разважнасці пры наладжванні двухбаковых адносін, ды і міжнароднага супрацоўніцтва ў цэлым. І ў адрозненне ад Венгрыі замест дыялогу будуюць платы, ствараюць штучныя абмежаванні для нашых і для сваіх грамадзян. Нам гэта цяжка зразумець. Але гэта факт. На гэтым фоне прыемна, што ў суседняй нам Еўропе ёсць сілы і, галоўнае, лідары, якія аб'ектыўна ацэньваюць абстаноўку і разумеюць, што на высокай дзяржаўнай пасадзе трэба дзейнічаць у інтарэсах сваёй краіны і свайго народа».*

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «У нас ёсць усё, таму беражыце гэта»

### Прэзідэнт азнаёміўся з вытворчасцю і пагутарыў з працоўным калектывам ААТ «Завод «Легмаш» у Оршы

**Першапачаткова на прадпрыемстве, створаным у 1945 годзе, выпрабляліся ацяпляльныя катлы. У 1952 годзе на яго базе была арганізавана вытворчасць па выпуску бытавых швейных машын, а затым — і прамысловых. Спецыялізаваўся завод і на выпуску швейнага і трыкатажнага абсталявання для лёгкай прамысловасці. Цяпер тут выпрабляецца шматпланавая прадукцыя: ад чыгунных патэльняў і казаноў да вырабаў, прызначаных для нафтагазавай галіны. З нядаўняга часу ААТ «Завод «Легмаш» спецыялізуецца і на вытворчасці прадукцыі ваеннага прызначэння. Аб стане і перспектывах развіцця прадпрыемства далажылі кіраўніку дзяржавы.**



Фота БелТА.

### «Губіць экспарт — гэта злачынства»

Каментуючы даклад аб асваенні вытворчасці новых відаў прадукцыі, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што не будзем жа мы ўвесь час «лапці плесці». «Трэба выпрабляць і сур'ёзную прадукцыю», — арыентаваў ён.

Камітэту дзяржаўнага кантролю кіраўнік дзяржавы даручыў адсочваць наступнае пытанне: пакуль працуем над рэалізацыяй ваенных заказаў, не павінна адысці на другі план і вытворчасць такой мірнай, запатрабаванай прадукцыі. «Калі ёсць попыт, трэба рабіць, — пераканаы беларускі лідар. — Ёсць навыкі, школа, людзі, і яны павінны гэта рабіць. На кантроль — вельмі жорсткі».

Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў, што ўсё гэта трэба рабіць адначасова і не на шкоду Ваеннапрамысловаму комплексу. «Трэба мірную прадукцыю, не для ВПК, выпускаць і нарошчваць, — дадаў ён. — Губіць экспарт — гэта злачынства».

Адпаведныя даручэнні прагучалі ў адрас не толькі старшыні Камітэта дзяржкантролю Васіля Герасімава, але і старшыні Віцебскага аблвыканкама Аляксандра Субоціна, памочніка Прэзідэнта — інспектара па Віцебскай вобласці Сяргея Ляўковіча.

Аляксандру Лукашэнку прадэманстравалі сякеры беларускай вытворчасці. Раней кіраўнік дзяржавы даручаў асвоіць выпуск гэтай айчыннай прадукцыі, каб вырабы былі не горшыя за замежныя аналагі. Прэзідэнт уважліва агледзеў сякеры і паабяцаў апрабаваць іх у справе. Адначасова ён паставіў жорсткую задачу перад прамыслоўцамі — на працягу года асвоіць вытворчасць тавараў, неабходных для работы з драўнінай.

«Гэта ганьба, што мы больш за палову (ад тэрыторыі краіны. — **«Зв.»**) маем лясы і ўсё завозім», — лічыць кіраўнік дзяржавы. Ён удакладніў, што падобная прадукцыя кожны год закупляецца на мільёны долараў. У сувязі з гэтым віцэпрэм'еру Пятру Пархомчыку, які курыруе прамысловасць, даручана арганізаваць на прадпрыемстве вытворчасць усяго, што патрэбна для лесу. Камітэту дзяржкантролю даручана ўзяць гэтае пытанне на кантроль.

### «Не проста аднавіць, а пераўзысці»

Традыцыйна падчас наведвання прадпрыемстваў кіраўнік дзяржавы ўдзяляе ўвагу працоўным калектывам. Рабочая паездка ў Оршу не стала выключэннем. Супрацоўнікі завода адрасавалі Прэзідэнту пытанні, якія іх цікавяць. Фармат размовы задаў сам беларускі лідар — размова павінна быць кароткая і шчырая.

Найперш Аляксандр Лукашэнка падзяліўся ўражаннямі ад убачанага. «Мы вельмі сур'ёзна пачалі працаваць у гэтай частцы Оршы, на «Легмашы», — канстатаваў ён. — Я не скажу, што вы, легмашаўцы. Тут ужо прыйшлі людзі з усяго свету, як у народзе кажуць. Сказаць, што я задаволены на сёння вашай работай, — абсалютна не. Таму і прыехаў. Не задаволены я і работай начальнікаў, больш за ўсё цэнтральных органаў. Але мне кажуць, што і вы кася-чылі тут нямала».

СТАР. 2

Падзея

# ЧЫМ ЗДЗІВІЦЬ «БЕЛАГРА-2024»?

**34-я Міжнародная спецыялізаваная выстава «БЕЛАГРА-2024» адбудзецца ў рамках Беларускага агропрамысловага тыдня, які адкрыецца 4 чэрвеня і працягнецца да 9 чэрвеня. У гэтым форуме прымуць удзел 490 кампаній з 11 краін, адзначыў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір ГРАКУН.**

Асноўныя экспазіцыі будуць ад Беларусі і Расіі, пры ўдзеле Казахстана, Кыргызстана, Манголіі, Германіі, Кітая, Пакістана, Турцыі, В'етнама і Палесціны. Акрамя таго, на выставу спецыяльна прыедуць 29 афіцыйных дэлегацый з Азербайджана, Таджыкістана, Венесуэлы, Егіпта, Зімбабвэ, Ірака, Экватарыяльнай Гвінеі ды іншых краін. Беларускі бок разлічвае заключыць з імі шэраг кантрактаў, якія прадугледжваюць пастаўку нашай тэхнікі, насення, угнаенняў і прадуктаў харчавання.



### Плошча адпавядае маштабу

Экспазіцыі выставы зоймуць 32,2 тысячы квадратных метраў, у тым ліку 7,2 тысячы «квадратаў» — у закрытых павільёнах. З кожным годам выстава «БЕЛАГРА» становіцца ўсё больш запатрабаванай. На гэты раз у ёй удзельнічаюць 40 новых прадпрыемстваў, у тым ліку 24 беларускіх. Новымі краінамі-ўдзельніцамі сёлета стануць Казахстан, Кыргызстан і Манголія. Расійская Федэрацыя будзе прадстаўлена на стэндах Міністэрства сельскай гаспадаркі і 13 рэгіёнамі: Бранскай, Растоўскай, Пензенскай, Варонежскай, Валгаградскай, Саратаўскай, Смаленскай, Ульянаўскай абласцямі, Рэспублікай Адыгея, Кабардзіна-Балкарыяй, Мардовіяй, Татарстанам і Краснадарскім краем.

Нацыянальная акадэмія навук Беларусі прадставіць апошнія распрацоўкі ў галіне жывёлагадоўлі, раслінаводства і перапрацоўкі, а Міністэрства прамысловасці — новыя ўзоры сельскагаспадарчай тэхнікі. У прыватнасці, у выставе будуць удзельнічаць такія буйныя прадпрыемствы галіны, як Мінскі трактарны завод, Мінскі маторны завод, «МАЗ — кіруючая кампанія холдынга «БелаўтаМАЗ», «Гомсельмаш», «Амкадор», «Бабруйскаграмаш» і іншыя.

СТАР. 4

# «У нас ёсць усё, таму беражыце гэта»

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Як былы дырэктар сельскагаспадарчага прадпрыемства, Прэзідэнт добра ведае: твае падначаленыя дрэнна працуюць тады, калі ты сам недапрацоўваеш. «Давайце з вамі дамовімся, што ў мяне да вас не будзе пытанняў, — сказаў Аляксандр Лукашэнка супрацоўнікам прадпрыемства. — Мы ўклалі каласальныя грошы для таго, каб вы не вярнуліся да вытворчасці швейных машын. Ды вы і не вернецеся. Я ўжо казаў, мы дарэмна страцілі гэтую вытворчасць. Гэта вельмі патрэбная і карысная вытворчасць. Але страцілі... Сёння я раблю ўсё для таго, каб вас вярнуць на высоканавуковую, высокавытворчую, дакладную і прыбытковую вытворчасць».

Кажучы аб вытворчасці для Ваенна-прамысловага комплексу, кіраўнік дзяржавы пераканаў: супрацоўнікам завода неабыякава, будзе ў краіне сур'ёзная абарона або не. «Для мяне — тым больш, — дадаў ён. — Тое, што вы тут робіце, — гэта для вас самае галоўнае і для вашых дзяцей».

Па словах Прэзідэнта, вырабы, якія ствараюцца на прадпрыемстве, патрэбны будуць заўсёды, асабліва цяпер. «Свет ашалеў, свет паглыблены ў войны, канфлікты, — патлумачыў ён. — І калі б у нас было цяпер больш прадукцыі ВПК, якую вы вырабляеце, мы былі б у тры разы багацейшымі. Але вы пакуль не выцягваеце нават мінімальныя паказчыкі. Вельмі спадзяюся, што пасля сённяшняй нашай сустрэчы і дакладаў міністраў мы павялічым гэтую вытворчасць. Але і будзем выконваць кантрактныя абавязацельствы».

Прэзідэнт канстатаваў, што летась і сёлета завадчане надрэнна папрацавалі над прадукцыяй для грамадзянскіх патрэб. Але варта не забываць і аб прадукцыі ваеннага прызначэння. «Яшчэ раз кажу: гэта вельмі перспектыўна, вельмі, — падкрэсліў беларускі лідар. — Калі нафтавікі і газавікі могуць адмовіцца ад вашай прадукцыі, то ад гэтай прадукцыі ў свеце не адмовяцца. Гэта вялікая ваша перспектыва, і гэта 80 % будзе вашай вытворчасці. Але і тое, што вы ўмелі рабіць і ішло на экспарт, загубіць не дазволю! Таму пастаўлена задача — не проста на 100 %, а на 120 % аднавіць вытворчасць грамадзянскай прадукцыі. Не проста аднавіць, а пераўзысці».

Кажучы аб вытворчасці прадукцыі для ВПК, Прэзідэнт падкрэсліў, што гэта вялізная перспектыва для прадпрыемства. «Вам патрэбны будуць людзі, мы будзем вам дапамагаць, — адзначыў ён. — Можа быць, заўсёды, можа быць, пакуль. Калі багатымі станеце, вы будзеце дзяржаве дапамагаць. Перш за ўсё, у будаўніцтве жылля. Вайскоўцы камерцыяй займацца не могуць. Яны сваё жыццё аддалі нам, дзяржаве. Мы ім абавязаны забяспечыць тылы: перш за ўсё — жыллё».

У прыярытэце па забеспячэнні ўласнымі квадратнымі метрамі застаюцца і шматдзетныя сем'і. Будзе будавацца жыллё і там, дзе плануецца ствараць новыя вытворчасці, заводы. «Тады людзі прыйдуць, — пераканаў беларускі лідар. — Людзі, можа быць, і не захочуць тут працаваць. Яны ўзважаць: трэба хата, трэба кватэра, жыллё для сям'і — пайду працаваць. Так было ў савецкія часы. І мы прасунемся ў гэтым кірунку, будзем падтрымліваць не толькі вас, але і ўсе прадпрыемствы, якія будуць стварацца, развівацца і гэтак далей».

Прэзідэнт пераканаў: гэта не справа — вазіць людзей на работу за 50—60 кіламетраў, як гэта часта бывае ў сельскай мясцовасці. «У Оршы месца для будаўніцтва хапае, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Горад — найцудоўнейшы, не мне вас пераконваць. Я і вы добра ведаеце: такіх гарадоў у свеце няшмат. Ды і ў Беларусі. Прыгожая рака, выдатныя ўмовы для жыцця. Ёсць дзе навучаць дзяцей. Крам, напэўна, хапае — дай Бог, грошы былі б. Трэба, каб было жыллё. У гэтым кірунку мы будзем працаваць. Таму я вас прашу, вы павінны з разуменнем да гэтага аднесціся, бо для Оршы зроблена нямала. Вы павінны выдаць тое, што я патрабую ад урада. Яны прыйшлі да вас, каб аднавіць вытворчыя памяшканні і вырабіць вельмі патрэбны для свету тавар. Вы бачыце, што робіцца. Не толькі ў свеце, але і тут, за плотам. Усялякае можа адбыцца. Нам гэта трэба. Па меншай меры, мы ў вас купім і дапаможам на экспарт прадаць вашу прадукцыю. Аднаўляйце тое, што вы прадавалі па грамадзянцы, і асвойвайце тое, што нам трэба па абаронцы».

## «У частцы павелічэння крэдытавання мы падсунемся»

Адно з пытанняў датычылася павелічэння памеру льготнага крэдыту на айчынныя тавары. Супрацоўніца прадпрыемства падзялілася, што нядаўна яе маладая сям'я набыла ўласнае жыллё. Дзякуючы льготнаму крэдыту, які выдаецца на тры гады ў памеры 12 тысяч рублёў пад 4 % гадавых, сям'я атрымала магчымасць абзавесціся бытавой тэхнікай айчыннай вытворчасці, мэбляй, таварамі для дома. Жанчына пацікавілася, ці плануецца пашырыць магчымасці выкарыстання такога крэдыту.

Прэзідэнт нагадаў, што дзяржава дапамагае людзям будаваць жыллё. «У былыя, нядаўнія нават часы, гэтаму былі б рады, — канстатаваў ён. — Цяпер кажуць: «Дапамаглі пабудаваць жыллё — дапамажыце нам купіць тэлевізар, пральную машыну, халадзільнік і гэтак далей». Трэба паціху ад гэтага адвыкаць. Але паколькі гэтага дабра мы вырабляем з лішкам, было прынята рашэнне прафінансаваць вас пэўнай часткай, каб падштурхнуць набываць беларускае. Мы будзем працягваць гэтую пактыку».

Кіраўнік дзяржавы паабяцаў разгледзець пытанне да канца года. «Відаць, гэтыя працэнты застануцца, можа быць, паўпрацэнта хтосьці там з банкаў дададсць, але вельмі-вельмі льготнае для таго, каб вы набывалі тое, што вырабляецца ў Беларусі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — У частцы павелічэння крэдытавання мы падсунемся».

Таксама плануецца пашырыць лінейку прадпрыемстваў, прадукцыю якіх можна будзе набываць на льготных умовах. «Урад унясе прапановы — мы прымем рашэнне», — запэўніў кіраўнік дзяржавы.

## «Мы павінны мець максімум свайго»

У кіраўніка дзяржавы спыталі, якія змяненні, унесеныя ў абноўленыя Ваенную дактрыну і Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі, — прынятыя на VII Усебеларускім народным сходзе, ён лічыць прынцыпова важнымі.

Прэзідэнт адзначыў, што вельмі шмат можа казаць аб гэтых дакументах, таму прапанаваў узяць і прачытаць тое, што ўжо апублікавана. «Мы не публікавалі пэўны пратакол — гэта значыць, больш канкрэтнае, тое, што мы з вамі тут робім, — удакладніў ён. — Калі хочаце, дзяржсакратар (Савета бяспекі. — **«Зв.»**) прыедзе да вас і проста вам у дэталях гэта раскажа. Ён узначальвае камісію адпаведную. Цяперашні начальнік Генштаба... Яны гэта ведаюць нават лепш за мяне, у дэталях. Што датычыцца канкрэтыкі, мы не можам публічна аб гэтым казаць, гэта закрытыя дакументы, але, згодна з прынятым дакументам, мы яшчэ загадзя пачалі разварочваць гэтую вытворчасць. Канцэпцыя і дактрына — гэта добра (гэта законы, кірункі, па якіх мы будзем дзейнічаць), але важная канкрэтыка. Калі мы кажам аб тым, што будзем абараняцца, пытанне — чым? Гэтаму ўдзяляем вялікую ўвагу, у тым ліку і ствараючы новыя вытворчасці. Мы ведаем, што і ў Расіі ёсць, у нашай Саюзнай дзяржаве і ў іншых краінах. Але разлічваць у час вайны на гэта мы не можам. Мы павінны мець максімум свайго. Гэта галоўнае».

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі — дакумент не новы. «Чацвёрты раз да гэтага вяртаемся, — канкрэтызаваў ён. — Чаму мы яе ўдасканальваем? Свет мяняецца, сітуацыя мяняецца, і войны мяняюцца: была вайна адна, а цяпер вайна іншая».

Кіраўнік дзяржавы дадаў, што ў сучаснай вайне многае вырашаюць не пяхота і артылерыя, як казалі раней, а беспілотная авіяцыя. «Вось калі б вы яшчэ выраблялі вельмі добрыя ўдарныя разведвальныя беспілотнікі, — прапанаваў завадчанам беларускі лідар. — Мы іх пачалі рабіць, але канкурэнцыя патрэбна. Падумайце. Калі возьмецеся за гэта, мы прафінансуем».

## «Нам трэба свой сектар захаваць»

Сакратар-рэферэнт прадпрыемства нагадала, што ўся краіна з заміраннем сэрца назірала за палётам у космас нашай касманаўткі Марыны Васілеўскай. Яна канстатавала, што многія дзяўчаты натхніліся гэтым і хочуць следаваць прыкладу першай беларускай жанчыны, якая паляцела ў космас. У кіраўніка дзяржавы папрасілі падзяліцца найбліжэйшымі планамі ў гэтай сферы.

«Мы занялі сваю нішу з даўніх часоў па асваенні космасу, — увёў у курс справы Прэзідэнт. — Вырабляем шмат для космасу, асабліва цяпер, пачынаючы ад мікраэлектронікі. ВПК працуе, дапамагаючы нашай касманаўтыцы, якая засталася ў Расіі. У савецкія часы мы многае рабілі, пачынаючы ад прыбораў, абшыўкі касмічных лятальных апаратаў. Асноўная вытворчасць у нас, і ажыццяўленне палётаў — у Расіі. Ствараць мы гэта ў сябе не будзем. Нам гэта не трэба. Калі створым, на гэта вялізныя грошы патрэбны, людзі патрэбны».

Па словах кіраўніка дзяржавы, у касмічных распрацоўках Беларусь мае сваю частку. Напрыклад, нашы спецыялісты вырабляюць добрыя касмічныя спадарожнікі дыстанцыйнага зандзіравання зямлі, спадарожнікі сувязі і іншае. «Гэта наша ніша, мы ў гэтым кірунку працавалі і будзем працаваць, — падкрэсліў беларускі лідар. — Плюс яшчэ мікраэлектроніка, якой у Расіі не стала. Гэта ўсё лягло на нашы плечы, бо старанна захавалі сваю вытворчасць. У іншых краінах гэтая вытворчасць была знішчана. Мы гэта захавалі і вырабляем. Калі нам трэба будзе запусціць у космас (пакуль такой неабходнасці няма) уласную ракету з пэўнымі спадарожнікамі, даследаваннямі і гэтак далей, мы можам скарыстацца еўрапейцамі, амерыканцамі. Японцы сёння, кітайцы, індусы ўжо на Месяц прызямліліся. Мы можам выкарыстоўваць іх. Заплацілі грошы — іх ракета нас закінула туды».

Прэзідэнт расказаў, што ад свайго калегі даведаўся аб тым, што расіяне пачынаюць будаваць сваю касмічную станцыю. «Цяпер яна міжнародная, куды наша касманаўтка лятала, — патлумачыў ён. — А яны плануюць будаваць уласную. Кітайцы сваю пабудавалі. Прэзідэнт Расіі сказаў: «Калі хочаш, далучайся. Будзем разам гэта рабіць, наколькі магчыма». Падумаем. Калі нашы разумныя людзі рашацца на гэта, будзем удзельнічаць. Але і гэта для нас не галоўнае. Нам трэба свой сектар захаваць».

Каментуючы тое, што многія дзяўчаты мараць паляцець у космас, Аляксандр Лукашэнка параіў адносіцца да гэтага больш прызямлена. Ён расказаў, што ёсць дамоўленасць з Уладзімірам Пуціным уключыць у лік касманаўтаў дваіх беларускіх касманаўтак: Марыну Васілеўскую і дублёра Анастасію Лянкову. «Гэта значыць, яны будуць праходзіць не паскораную падрыхтоўку, як гэта было, а пастаянную, і паляцець яны, можа, праз тры, а можа праз пяць гадоў па канкрэтнай праграме, — патлумачыў Прэзідэнт. — Гэта значыць, патрэбныя канкрэтныя задачы, канкрэтная праграма, якая будзе рэалізоўвацца падчас палёту. Гэта не проста паляцеў-прыляцеў, і ўсе апладзіруюць, з заміраннем сэрца, як вы сказалі, глядзяць. Не. Гэта вялікая цяжкая работа. Таму, калі нехта хоча, — калі ласка. Мы дамовіліся з расіянамі, яны гатовы. Пройдзеце конкурс — будзеце ў групе касманаўтаў рыхтавацца. Не пройдзеце — значыць, не будзеце. Гэта сур'ёзна. З дзвюх тысяч выбралі нашу дзяўчыну. Мы выбралі і прапанавалі ім жанчыну. Як «жаночы» Прэзідэнт, прапанаваў жанчыну. Вось яна і паляцела, вярнулася. Не думаю, што яна хоча паляцець ізноў (у найбліжэйшы час мы абмяркуем гэта з ёй), і не думаю, што наша дублёр таксама марыць аб палёце ў космас. Бо яны ўжо паспыталі гэтага дабра і разумеюць, што жыццё адно».

Таму кіраўнік дзяржавы пацікавіўся: ці варта мяняць «Легмаш» і сваю прафесію сакратара-рэферэнта на касмічную? «Гэта звычайная работа, цяжкая работа, з вялікай рызыкай, — кажучы пра космас, падкрэсліў ён. — Але, вядома, папулярная. Таму, усё гэта ўзважыўшы, падумайце, трэба вам ісці ў атрад касманаўтаў рыхтавацца або не. Я б вам не раіў. Але калі, упасі Гасподзь, ад вашага калектыву чалавек такі знойдзецца, буду падтрымліваць».

## «Нам Бог падарыў унікальную краіну»

У кіраўніка дзяржавы спыталі, як ён плануе адпачыць летам і ці ёсць у яго любімыя месцы адпачынку. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў агульнапрынятым разуменні пайсці ў водпуск ён не можа. «Прэзідэнт беларускі не можа адпачыць, таму што ў яго няма віцэ-прэзідэнта, — сказаў ён. — Дзе б ні знаходзіўся Прэзідэнт Беларусі, ён свае паўнамоцтвы нікому перадаць па Канстытуцыі не можа».

Кіраўнік дзяржавы падзяліўся, што ўспрымае водпуск як змену сітуацыі, абставін, змену рэжыму жыцця. «Я не ўяўляю, як можна легчы на пляжы і смажыцца пад сонцам, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Я вясковы чалавек. З дзяцінства мяне да гэтага не прывучылі. Гэта не маё. Мне трэба чымсьці займацца». Напрыклад, раніцу Прэзідэнт пачынае са спорту, але пры ўмове, што ў яго ёсць на гэта час.

Адказ на пытанне, якое ў кіраўніка дзяржавы любімае месца, быў кароткі і, напэўна, відавочны — Орша. Аляксандр Лукашэнка патлумачыў, што з гэтым горадам у яго звязана шмат успамінаў з дзяцінства, таму на малой радзіме кіраўнік дзяржавы бывае пры любой магчымасці.

Прэзідэнт дадаў, што па родзе дзейнасці бывае ў многіх краінах па ўсім свеце, але заўсёды з радасцю вяртаецца на Радзіму. «Нічога найлепш няма, чым Беларусь, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Нам Бог падарыў унікальную краіну. Падумайце. Тры месяцы зіма: падмарозіць добранька, ажывіць прыроду. Тры — вясна. Тры месяцы лета і тры — восені. Тыдзень туды. Тыдзень сюды. У нас усе поры года. Хто гэтым можа пахваліцца? У нас ёсць усё. Мы павінны гэта зберагчы, для нашых дзяцей у тым ліку».

Супрацоўнікі ААТ «Легмаш» падарылі кіраўніку дзяржавы ўзоры прадукцыі прадпрыемства. Сярод іх — вялікі чыгунны казан для прыгатавання плову. Выказаўшы ўдзячнасць за падарунак, Аляксандр Лукашэнка падзяліўся, што добра гатуе гэту страву. А навучыў гатаваць плоў кіраўніка дзяржавы яго калега, Прэзідэнт Таджыкістана Эмамалі Рахмон.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што аддае перавагу звычайным вясковым стравам, да якіх даўно прызвычаіўся. Ён пераканаў: вельмі добрая рэцэптура прыгатавання многіх прадуктаў была ў Савецкім Саюзе. Дарэчы, многія рэцэпты таго часу, па патрабаванні кіраўніка дзяржавы, аднаўляюць і вяртаюць у вытворчасць. У прыватнасці, гэта датычыцца кандытарскіх вырабаў, цукерак, хлеба. Гэтай беларускай прадукцыі даецца высокая адзнака, у тым ліку з боку замежных лідараў.

Рэзюмуючы, Аляксандр Лукашэнка пажадаў супрацоўнікам прадпрыемства берагчы сябе і не спадзявацца на тое, што дзесьці можа быць лепш.

**Вераніка КАНЮТА.**

Наталля КАЧАНАВА:

# «НА ЧАЛЕ ПАЛІТЫКІ БЕЛАРУСІ І КІТАЯ — ПЕРШ ЗА ЎСЁ НАРОД»

**Працягваецца візіт афіцыйнай парламенцкай дэлегацыі на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай у Кітайскую Народную Рэспубліку. Праграма другога дня візіту атрымалася насычаная: беларуская дэлегацыя ўсклала кветкі да помніка Народных герояў, наведала бальніцу «Чааян» у Пекіне, правяла шэраг сустрэч. Наталля Качанава сустрэлася з намеснікам Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Хань Чжэнам.**

Паколькі Кітай і Беларусь — усепагодныя, усебаковыя стратэгічныя партнёры, сустрэча прайшла ў сяброўскай атмасферы. Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што Беларусь ганарыцца сяброўствам з Кітаем: «Гісторыя беларуска-кітайскіх адносін налічвае больш за тры дзесяцігоддзі, і за гэтыя гады выбудаваліся добрыя, сяброўскія адносіны паміж нашымі краінамі. Дзякуючы нашым лідарам, кіраўнікам нашых дзяржаў Аляксандру Лукашэнку і Сі Цзіньпіну наша супрацоўніцтва сёння з'яўляецца ўсепагодным, усебаковым і стратэгічным. Кітай для Беларусі заўсёды быў, ёсць і застанецца надзейным партнёрам». Наталля Качанава адзначыла, што Беларусь цвёрда падтрымлівае прынцып аднаго Кітая. «Мы аказвалі і працягваем аказваць падтрымку вашай краіне па ўсіх вострых пытаннях, у тым ліку па Сіньцзяне, Ганконгу, Тыбеце і Тайваню, а таксама ў рамках Руху недалучэння па пытанні Паўднёва-Кітайскага мора. У сваю чаргу мы шчыра дзякуем вам за пастаянную і сістэмную падтрымку Беларусі па пытанні ўступлення ў ШАС у якасці паўнапраўнага члена арганізацыі», — адзначыла яна.

Наталля Качанава нагадала, што ў 2023 годзе заключана міжпарламенцкае пагадненне паміж Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь і Усекітайскім сходам народных прадстаўнікоў. Павышаны статус механізму міжпарламенцкага супрацоўніцтва — створаны Камітэт высокага ўзроўню па супрацоўніцтве паміж заканадаўчымі органамі дзвюх краін. Сфарміраваны склад камітэта. «Паглыбленне ўзаемадзеяння Беларусі і Кітая вызначана падабенствам нашых ідэалогій і самой логікай геапалітычных працэсаў, якія адбываюцца. У сучасных няпростых геапалітычных умовах адносіны нашых краін дынамічна развіваюцца, хутка адаптуюцца пад зменлівыя рэаліі, захоўваючы трываласць і глыбіню практычнага ўзаемадзеяння. Аб эфектыўным развіцці двухбаковых адносін сведчаць вынікі ўзаемнага гандлю», — сказала Наталля Качанава. Яна прывяла прыклады: з моманту ўстанаўлення дыпламатычных адносін тавараабарот паміж Беларуссю і Кітаем вырас больш як у 200 разоў.

Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла салідарнасць з Кітаем па асноўных прынцыпах геапалітычнай бяспекі. «Мір, згода, суверэнітэт, неўмяшанне ва ўнутраныя справы — гэта асноўнае, тое, на чым сёння выбудоўваецца палітыка нашых дзяржаў. Тыя задачы, якія пастаўлены кіраўнікамі Беларусі і Кітая, — гэта мірны дабрабыт нашых краін і народаў», — рэзюмавала кіраўнік беларускай дэлегацыі.

Са свайго боку намеснік Старшыні КНР Хань Чжэн заявіў, што Кітай надае вялікае значэнне адносінам з Беларуссю: «За апошнія гады пад стратэгічным кіраўніцтвам Старшыні Сі Цзіньпіна і Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі кітайска-беларускія адносіны дэманструюць устойлівую дынаміку развіцця. Упэўнены, што афіцыйны візіт паслужыць стымулам для развіцця нашага сяброўства і супрацоўніцтва».

## Мір, згода, суверэнітэт

Старшыня Савета Рэспублікі таксама сустрэлася са старшынёй Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў Чжаа Лэцзі. Па яе словах, непарушная дружба і ўзаемны давер Беларусі і Кітая — заслуга кіраўнікоў дзвюх краін. «Гэта выдатныя палітыкі сусветнага маштабу, сапраўдныя народныя лідары і патрыёты, якія цалкам прысвячаюць сябе служэнню інтарэсам сваёй краіны і народа, — сказала Наталля Качанава. — У нашых міждзяржаўных адносінах важнае значэнне маюць рэгулярныя візіты на найвышэйшым і высокім узроўнях. Сустрэчы нашых лідараў надалі магутны імпульс паглыбленню традыцыйных кірункаў супрацоўніцтва і вывелі яго на беспрэцэдэнтна высокі ўзровень усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства. Па словах Наталлі Качанавай, сустрэчы, якія прайшлі падчас афіцыйнага візіту беларускай парламенцкай дэлегацыі, яшчэ раз паказалі, што палітыка нашых дзяржаў абсалютна падобная. «Таму што на чале палітыкі Беларусі і Кітая перш за ўсё народ. А на знешнім контуры — мір, згода, суверэнітэт і незалежнасць нашых дзяржаў, неўмяшанне ва ўнутраныя справы. Упэўнена, што наш візіт надасць новых імпульс супрацоўніцтву Беларусі і Кітая абсалютна па ўсіх кірунках», — падкрэсліла кіраўнік беларускай дэлегацыі.

Савет Рэспублікі — палата тэрытарыяльнага прадстаўніцтва — усяляк зацікаўлены ў развіцці пабрацімскіх сувязяў міжрэгіянальнага супрацоўніцтва Беларусі і Кітая. «Нашы краіны маюць вялікі патэнцыял узаемадзеяння па лініі грамадскіх арганізацый, палітычных партый, валанцёрскіх рухаў. Актуальнымі кірункамі міжпарламенцкага ўзаемадзеяння бачацца супрацоўніцтвы ў сферы аховы здароўя, адукацыі, навукі і культуры. Сёння, наведваючы адну з медыцынскіх устаноў, мы пераканаліся ў гэтым. Мы ўбачылі, што нам ёсць чым падзяліцца адна з адной. Мэтазгодна на рэгулярнай аснове праводзіць абмены паміж спецыялістамі Беларусі і Кітая, працягваць сумесную падрыхтоўку кадраў, укараняць новыя сумесныя адукацыйныя і даследчыя праграмы», — расказала Наталля Качанава.

## Мы ментальна блізкія

У размове з журналістамі Наталля Качанава назвала візіт беларускай парламенцкай дэлегацыі ў Кітай вельмі значным для беларусаў. Падчас гэтага візіту прайшло першае пасяджэнне Камітэта высокага ўзроўню супрацоўніцтва паміж парламентарыямі Беларусі і Кітая, які быў створаны зусім нядаўна. Як расказала Наталля Качанава, падчас пасяджэння былі абмеркаваны ўсе перспектывы і кірункі супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі. У цэнтры ўвагі — пытанні заканадаўчай базы Беларусі і Кітая, сумесны ўдзел у міжнародных арганізацыях, адстойванне інтарэсаў дзвюх краін на міжнароднай арэне, пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця і гуманітарнай сферы. Спектр пытанняў атрымаўся шырокі і шматпланавы, бо супрацоўніцтва Беларусі і Кітая развіваецца ва ўсіх галінах. «Самае галоўнае, што мы ментальна блізкія. Я ўпершыню ў Кітаі, і я адчула, наколькі сапраўды падобныя нашы падыходы ва ўнутранай палітыцы, у знешняй палітыцы. Калі казаць пра ўнутраную палітыку нашых краін, гэта найперш людзі. Гэта самае галоўнае. Мы робім усё, як у Беларусі, так і ў Кітаі, каб нашы людзі жылі камфортна, у дабрабыце. Павышэнне дабрабыту насельніцтва — гэта галоўны падыход ва ўнутранай палітыцы нашых краін. Калі казаць пра знешнюю палітыку, тут у нас абсалютна ідэнтычныя падыходы — гэта міралюбівая палітыка, гэта суверэнітэт і незалежнасць, неўмяшанне ва ўнутраныя справы краін і, канешне, прасоўванне палітыкі шматпалярнага свету», — сказала Наталля Качанава. Яна запэўніла, што, нягледзячы на ўсе знешнія выклікі, Беларусь і Кітай будуць працягваць праводзіць сумесную палітыку. «Мы ганарымся адносінамі з Вялікім Кітаем. Я ўбачыла тут вельмі добрае стаўленне да беларусаў. Кітай і кітайскі народ сапраўды з вялікай павагай ставіцца да нашай краіны, да нашага народа, да нашага Прэзідэнта», — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі.

**Паводле БелТА і прэс-службы Савета Рэспублікі.**

Глабальны кантэкст



# Каштаны для гегемона

### Хто выступае ў ролі малпы, якая цягае іх з самага полымя, відавочна

**У цяперашні час планета ўвайшла ў «гарачую стадыю» пераўладкавання свету. Створаная пасля Другой сусветнай вайны сістэма стрымак і процівag канчаткова разбурана. Сёння імкліва фарміруюцца новыя цэнтры сілы, Захад і ЗША паслядоўна губляюць свой уплыў, а ваенная моц становіцца іх галоўным палітычным аргументам. Яскравым прыкладам таму з'яўляюцца баявыя дзеянні на Украіне, у рамках якіх «заходні свет абараняе дэмакратыю ад аўтарытарызму».**

За дужкамі застаецца тое, што ЗША і іх саюзнікі мэтанакіравана і загадзя рыхтаваліся да супрацьстаяння з Расіяй. Выпрацоўваліся палітычныя, эканамічныя, ваенныя і іншыя меры для знішчэння геапалітычнага канкурэнта. Яшчэ ў маі 2019 года аналітычным даследаванні карпарацыі RAND, выкананым па замове ўрада ЗША, пад назвай Extending Russia. Competing from advantageous ground («Расцягваючы Расію. Супрацьстаянне з выгадных пазіцый»), планавалася шляхам эскалацыі ўнутранага пратэснага патэнцыялу пазбавіць Расію саюзнікаў, стварыць уздоўж яе заходніх межаў «санітарны кардон» і ўключыць Беларусь у сферу ўплыву Захаду. За гэтым рушылі ўслед падзеі жніўня 2020 года, калі ў нашай краіне была зроблена спроба дзяржаўнага перавароту, а беларускі народ разглядаўся «цывілізаваным Захадам» не больш, чым сродак дасягнення ўласных мэт.

Беларусь выстаяла і абараніла ўласны суверэнітэт. Аднак вашынгтонскія ястрабы не прызвычаіліся адступаць, тым больш калі на коне ўласны прэстыж і вельмі вялікія грошы. Невыпадкова чарговае даследаванне RAND 2021 года, выкананае па замове Вашынгтона, насіла сапраўды адыёзную назву: «Канкураваць з Расіяй павайсковаму. Наступствы звычайнага і ядзернага канфліктаў». Чарговы раз праявіліся тэарэтычныя канцэпцыі па «раскладанні саперніка знутры». Галоўным метадам уздзеяння абвяшчалася супрацьпастаўленне Расіі ўсім астатнім дзяржавам, рускага народа — усяму астатняму свету, а ўнутры краіны — нацкоўванне асобных груп насельніцтва паміж сабой. Важнае месца адводзілася пытанням падрыву эканомікі за кошт палітыкі ізаляцыі і санкцый, а таксама прамому ваеннаму супрацьстаянню «чужымі рукамі». Гэта павінна было прывесці да пагаршэння ўзроўню жыцця, абвастрэння ўнутрыпалітычнай сітуацыі, знясілення рэсурсаў і распаду Расіі. У гэтым сцэнарыі ў якасці ключавых элементаў разглядаліся НАТА і ЕС, а прыладай асноўнага ўдару павінна была стаць Украіна, пераўтвораная за перыяд з 2014 года ў неафашысцкі лагер.

Паводле ацэнак амерыканскіх аналітыкаў, комплекснае санкцыйнае ўздзеянне ў спалучэнні з рэальнымі баявымі дзеяннямі павінна прывесці да капітуляцыі Масквы і аднаўлення дамінавання ЗША. У якасці спадарожных вынікаў разглядалася: пераадоленне фінансавага і палітычнага крызісаў у Вашынгтоне і Лондане, кансалідацыя Еўропы і НАТА, рост абаронных выдаткаў і віток гонкі ўзбраенняў, перахразмеркаванне сусветных рэсурсаў і інтэнсіфікацыя працэсу глабалізацыі. Па сутнасці, размова ішла аб фарміраванні новай архітэктуры светаўладкавання з захаваннем заходняга лідарства.

Усведамляючы небяспеку падобнага развіцця абстаноўкі ў канцы 2021 года, Расія сфарміравала прапановы па забеспячэнні гарантый уласнай бяспекі з боку ЗША і НАТА. У прыватнасці, дэкларавалася неабходнасць юрыдычнага замацавання адмовы ад далейшага пашырэння альянсу на ўсход, ад далучэння да блока Украіны і ад стварэння ваенных баз у постсавецкіх краінах. Акрамя таго, прапаноўвалася не размяшчаць ударныя ўзбраенні НАТА каля граніц Расіі і адвесці сілы на пазіцыі 1997 года.

Тры этапы перагавораў, якія прайшлі ў студзені 2022 года, паказалі, што пазіцыя альянсу па пытанні пашырэння застаецца нязменнай, а Захад цалкам ігнаруе расійскія інтарэсы. На словах дэкларуючы прынцыпы міралюбнасці, Паўночнаатлантычны саюз даўно стаў інструментам аперыравання ЗША, і ўсе яго памкненні звязаны з паслабленнем Расіі. Калектыўнае нашпігоўванне Украіны зброяй і ігнараванне Мінскіх пагадненняў, падтрымка прафашысцкай палітыкі Кіева і заахвочванне генацыду ўласнага народа на Данбасе, адмова ад замацавання гарантый бяспекі паслужылі прычынамі пачатку Расіяй спецыяльнай ваеннай аперацыі (СВА) у лютым 2022 года.

Да яе пачатку Захад знаходзіўся ў поўнай упэўненасці, што чарговы «вызваленчы паход» усебакова падрыхтаваны і забяспечаны, а аб'яднаны патэнцыял «цывілізаванага свету» шматкроць пераўзыходзіць магчымасці «адсталага Усходу». У гэтых умовах адзіны зыход — знішчэнне стратэгічнага саперніка (Расіі) чужымі рукамі на рэальным полі бою.

Вашынгтон быў абавязаны прадэманстраваць усяму свету, што Амерыка здольная жорстка караць тых, хто кідае ёй выклік, і тым самым аднавіць веру ў сваю магутнасць, падараваную ў XXI стагоддзі. У сувязі з гэтым паказальныя палажэнні «Часовых указанняў па стратэгіі нацыянальнай бяспекі» ад 3 сакавіка 2021 года адміністрацыі Дж. Байдэна. У дакуменце адзначаецца: «Дасягненне знешнепалітычных мэт грунтуецца на ключавой стратэгічнай прапанове: Злучаныя Штаты павінны аднавіць свае непераходзячыя перавагі з тым, каб мы маглі адказваць на сённяшнія выклікі з пазіцыі сілы. Мы... адновім наша месца ў міжнародных інстытутах; узнімем нашы каштоўнасці ў сябе дома і выступім у абарону іх па ўсім свеце; мадэрнізуем наш ваенны патэнцыял... і ажывім непарасягнутую сетку альянсаў і партнёрстваў Амерыкі».

Гэтыя ўстаноўкі з'яўляюцца лейтматывам дзейнасці ЗША і няўхільна рэалізоўваюцца. Пры гэтым не ўлічваюцца аб'ектыўныя працэсы, якія адбываюцца ў свеце: сістэмны крызіс амерыканскай эканомікі, знясіленне рэсурсаў і паслабленне пазіцый долара ЗША як сусветнай рэзервовай валюты; дэградацыя заходняй «дэмакратыі» і эканамічнай мадэлі «грамадства спажывання»; змена балансу сіл і фарміраванне новых цэнтраў сілы.

Спробы ЗША вырашаць уласныя праблемы традыцыйнымі для іх спосабамі — доўгатэрміновым ваенным супрацьстаяннем, халоднай вайной, на новым тэхналагічным узроўні з элементамі буйнамаштабнага гібрыднага супрацьборства, — сталі прычынамі ўкраінскіх падзей. У гэтых умовах ва ўсіх кутках планеты і ў беларускім грамадстве расце запыт на бяспеку. Мір становіцца галоўнай каштоўнасцю ў сучаснай палітычнай рэальнасці, а яго забеспячэнне — найважнейшай задачай дзяржавы.

**Мікалай БУЗІН,**
**старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў,**
**прафесар.**

Блізкая ўлада

# БЫЦЬ АДКРЫТЫМ У РАБОЦЕ З ЛЮДЗЬМІ

**Каля 30 чалавек з усіх куткоў Мінскай вобласці прыехалі на асабісты прыём да старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандра ТУРЧЫНА.**

Жыхароў цэнтральнага рэгіёна хвалююць разнастайныя пытанні. Асноўны працэнт — праблемы ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, будаўніцтва дарог, правядзенне ліній электраперадачы, якасць вады.

Людміла Алегаўна з горада Барысаў прыйшла на прыём да губернатара адразу з некалькімі тэмамі. Яна расказала, што дарога па завулку Матросава (дзе пражывае заяўніца) знаходзіцца ў нездавальняльным стане. «Раней там быў добры асфальт, які з часам прыйшоў у непрыдатнасць, — сцвярджае Людміла. — Але праблема яшчэ і ў тым, што па завулку Матросава знаходзіцца два вытворчыя прадпрыемствы: Нарыхтоўчая кантора па прыёме металалому, куды практычна кожны дзень прыязджае тэхніка забіраць сыравіну, і вытворчасць, куды круглыя суткі накіроўваюцца буйныя фуры. Вялікая колькасць грузавых машын і сапсавала дарогу».

Па словах заяўніцы, мясцовыя службы падсыпалі дарогу гравіем. Але завулак знаходзіцца на ўзвышшы, таму гравій з часам змыла даждом. «Мы з 2012 года ваюем за сваю дарогу! Яе ўжо даўно трэба заасфальтаваць. Людзі зімой, восенню і вясной тонуць па калена ў гразі, а летам задыхаюцца ад пылу, — абураецца пенсіянерка. — Каб такіх праблем ізноў не ўзнікала, пункт прыёму сыравіны мэтазгодна перанесці ў іншую частку горада. Мы ж не толькі за дарогу перажываем. Мы за сваё жыццё баімся! А раптам гэты кавалак арматуры пры пагрузцы ўпадзе на галаву, калі будзем праходзіць міма? Ды і дзеці ўвесь час там ходзяць».

**Старшыня Барысаўскага райвыканкама Мікалай КАРПОВІЧ** адзначыў, што асфальтаванне завулка Матросава не планецца. «Дарога падсыпаецца перыядычна гравіем. Асфальт мы людзям не абяцалі», — праінфармаваў ён.

Аднак заяўніца падала дакумент. У ім — адказ Барысаўскага райвыканкама ад 2013 года, дзе чорным па белым пазначана: дарога па Матросава будзе заасфальтавана. «Вы ведаеце мае ўмовы. Абяцанне, дадзенае людзям, трэба выканаць у бягучым годзе», — распарадзіўся старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр Турчын.

Наступнае пытанне, якое хвалюе барысаўчанку, — вытворчыя памяшканні, куды заязджаюць габарытныя машыны. Яна просіць перанесці іх далей ад Матросава, бо з-за шуму не можа спаць па начах.

«У месяц на пункт прыёму сыравіны прыязджае ўсяго 2-3 машыны», — запэўніў Мікалай Карповіч. Аднак пенсіянерка з гэтым не пагадзілася. Па яе словах, туды кожны дзень заязджае па некалькі машын. Губернатар даручыў правесці маніторынг,



Фота БелТА.

каб мець дакладнае ўяўленне: колькі сапраўды машын заязджае на пункт прыёму другаснай сыравіны па вуліцы Матросава. «Калі там насамрэч ідзе шмат машын, трэба разгледзець пытанне пераносу нарыхтоўчага пункта, лічыць Аляксандр Турчын. — Але канчатковае рашэнне можна будзе прыняць толькі пасля месяца маніторынгу. І яшчэ раз нагадваю: самае галоўнае — адкрытасць у рабоце з людзьмі. Каб яны самі бачылі вынікі таго ж маніторынгу і потым у іх не ўзнікала пытанняў».

Трэцяя тэма, што хвалюе пенсіянерку, — вытворчыя памяшканні на месцы былога прадпрыемства. У пэўны момант індывідуальны прадпрымальнік з Оршы выкупіў іх. Цяпер, па словах заяўніцы, і днём, і ноччу туды прыязджаюць фуры, у якіх вельмі шумна нешта загружаюць і выгружаюць. Як высветлілася, у гэтых памяшканнях ажыццяўляецца нарэзка плёнкі для нацяжных столяў.

«Трэба праверыць гэту вытворчасць: як яна працуе, на якіх падставах перайшла цяперашняму ўладальніку. І чаму працуе, па словах Людмілы Алегаўны, нават ноччу», — падагульніў губернатар.

Яшчэ адна барысаўчанка, якая з'яўляецца шматдзетнай маці, папрасіла садзейнічання ў выдзяленні яе сям'і зямельнага ўчастка пад будаўніцтва прыватнага дома. Раней сям'я ўжо атрымлівала ўчастак, аднак асвоіць не змагла. Па словах заяўніцы, з-за складанай жыццёвай сітуацыі яна была вымушана прадаць першы ўчастак. Цяпер жа, калі ў сям'і з'явілася магчымасць будаваць жыллё, у выдачы ўчастка для будаўніцтва адмаўляюць.

«Вы прадалі бясплатна атрыманы зямельны ўчастак, па законе дзяржава аказвае дапамогу адзін раз. Дзе гарантыя, што гісторыя не паўторыцца? — запытаў Аляксандр Турчын. — Хочаце пабудаваць жыллё — можаце набыць зямлю з аўкцыёну». У выніку губернатар Міншчыны даручыў кіраўніцтву раёна аказаць дапамогу ў падборы ўчастка, каб цана на яго была прымальнай для сям'і.

Жыхарку вёскі Шапавалы Валожынскага раёна таксама хвалюе дарожная тэма. Там, па вуліцы Цэнтральнай, патрабуецца асфальтаванне дзеля бяспечнага дарожнага руху. «Не скажу, што ёсць пытанні па дарожным пакрыцці. Праблема крыху ў іншым. Па дарозе вельмі інтэнсіўны транспартны рух. Хтосьці едзе праз Шапавалы ў вайсковую часць, многія накіроўваюцца на дачы. Калі ў звычайны будні дзень па Цэнтральнай вуліцы праязджае 200—300 машын, то ў пятніцу, суботу і нядзелю — да 1000. Ад гэтага пыл невыносна страшны. Не можам ні ў двор выйсці, ні бялізну павесіць сушыцца. На агародзе няма сэнсу нешта вырошчваць: гароднiна ж убярэ ўвесь гэты бруд і пыл ад машын», — расказала заяўніца.

Па словах жанчыны, яна неаднаразова звярталася ў розныя службы з просьбай заасфальтаваць дарогу. Ёй абяцалі, што асфальт пакладуць у 2022 годзе, на крайні выпадак — у 2023-м. Але ў выніку ўсё абмежавалася падсыпкай.

«Трэба ўчастак, які праходзіць па населеным пункце, заасфальтаваць, каб праблем з пылам больш не было. Гэта неабходна зрабіць у бягучым годзе. Тым больш што Валожын прымае абласныя «Дажынкі», — патрабаваў губернатар.

У Крупскім раёне паміж вёскамі Ухвала і Мікалаеўка размешчаны пешаходны мост. Яго актыўна эксплуатуюць, нягледзячы на наяўнасць аб'язной дарогі. Сёння мост прызнаны аварыйным. Заяўнікі звярнуліся ў мясцовыя органы ўлады, але ў рамонце ім адмовілі. Мостам мала хто карыстаецца, таму ў Крупскім райвыканкаме рамантаваць яго лічаць немэтазгодным. «Магчыма, мае сэнс узвесці драўляны мост. І калі кошт апынецца прымальны, то пытанне вырашыцца станоўча», — прапанаваў Аляксандр Турчын.

Жыхарка сталіцы жадае атрымаць участак пад жыллёвае будаўніцтва ў Бяларуцкім сельвыканкаме Лагойскага раёна. Па словах заяўніцы, у гэтым раёне ёсць свабодныя ўчасткі. Больш за тое, сёння іх прадаюць на аўкцыёне. «Жыву з дзецьмі ў аднапакаёвай кватэры ў Мінску, знаходжуся ў чарзе і ў горадзе, аднак будаваць дом хачу за горадам, у такім месцы, каб было зручна дабірацца да працы і вучобы», — патлумачыла заяўніца.

Аляксандр Турчын даручыў разабрацца з продажам участкаў у Бяларуцкім сельсавеце, іх выкарыстаннем уласнікамі і мерамі, якія прымаюцца. «Мінскі і Лагойскі раёны вельмі запатрабаваны. Набыць участкі ў іх магчыма толькі з аўкцыёну», — разам з тым паведаміў старшыня Мінскага аблвыканкама. Аляксандр Турчын параіў заяўніцы разгледзець для атрымання ўчастка іншыя раён.

Асабісты прыём грамадзян у губернатара працягваўся цэлы дзень. Акрамя вышэйпералічаных праблем, да яго звярталіся з пытаннямі аб пагрозе падтаплення падвальнага памяшкання ў жылым доме, аб адсутнасці электразабеспячэння, аб будаўніцтве новых інжынерных сетак, накont змянення спрэчак і іншага. Губернатар уважліва выслухаў кожнага, усе агучаныя пытанні ўзяты ім пад асабісты кантроль.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# ЧЫМ ЗДЗІВІЦЬ «БЕЛАГРА-2024»?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У рамках дзелавой праграмы выставы пройдзе каля 20 тэматычных семінараў і канферэнцый, на якіх будуць абмяркоўвацца забеспячэнне канкурэнтаздольнай прадукцыяй, племянная жывёлагадоўля, раслінаводства, машынабудаванне, аграрная адукацыя, перспектывы супрацоўніцтва з краінамі блізкага і далёкага замежжа, удакладніў намеснік міністра.

## Гандлёвыя пляцоўкі і конкурсы

На выставе будуць працаваць кірмашы-продажы, розныя гандлёвыя пляцоўкі. Пройдуць конкурсы на найлепшую племянную малочную карову, «Найлепшы араты», «Чэмпіён смаку», дэманстрацыйныя паказы племянных жывёл і сельскагаспадарчай тэхнікі. Традыцыйна на галоўнай сцэне адбудуцца выступленні творчых калектываў. Таксама гледачоў чакае праграма, падрыхтаваная Рэспубліканскім цэнтрам алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорту і конегадоўлі, на асобнай пляцоўцы кожны ахвотны зможа кіраваць тэхнікай МТЗ.

«Навінкай выставы стане «Партызанская паляна», арганізаваная Міністэрствам абароны. Думаю, што кожны наведвальнік знойдзе для сябе нешта цікавае», — адзначыў Уладзімір Гракун. Намеснік міністра падкрэсліў, што «БЕЛАГРА» стане карыснай і для тых, хто вядзе прысядзібную гаспадарку. На выставе будзе прадстаўлены шырокі спектр насення, парод хатніх жывёл, тэхналогіі апрацоўкі глебы і многае іншае, здольнае выклікаць цікавасць у сельскіх жыхароў.

## Баклажан не будзе рэдкасцю

Спікер адзначыў, што беларускія цяплічныя прадпрыемствы будуць развіваць вытворчасць грунтавой агародніны. Экспазіцыя плодаагароднiннай прадукцыі на выставе «БЕЛАГРА-2024» будзе прадстаўлена 12 прадпрыемствамі. Яны прадставяць сваю прадукцыю, вырашчаную ў ахаваным грунце.

«Гэта сёння новы кірунак. Мы поўнасцю забяспечылі наша насельніцтва агуркамі. Наступная задача — забяспечыць таматамі, а ў далейшым — баклажанамі, перцам і зялёнымі культурамі. У экспазіцыі можна будзе азнаёміцца з работай цяплічных камбінатаў, ацаніць і набыць іх прадукцыю», — адзначыў намеснік міністра. Уладзімір Гракун удакладніў, што ва ўсе дні дзейнасці выставы «БЕЛАГРА-2024» будзе арганізаваны кірмаш-продаж прадуктаў харчавання па даступных цэнах.

Нагадаем, што выстава «БЕЛАГРА-2024» пройдзе ў выставачным цэнтры Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі Камень». Уваход бясплатны. У дні выставы ў Мінску са станцыі «Партызанская» будзе курсіраваць спецыяльны транспарт.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Экс-прэм'еру Тайланда прад'яўлена абвінавачанне па справе аб абразе манархіі



Генеральная пракуратура Тайланда прад'явіла абвінавачанне былому прэм'ер-міністру Таксіну Чынавату па артыкуле аб абразе манархіі, які прадугледжвае турэмнае зняволенне на тэрмін ад 3 да 15 гадоў. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на тэлеканал Thai PBS. Чакаецца, што справа будзе перададзена ў суд 18 чэрвеня, паколькі Чынават запытаў адтэрміноўку яго разгляду ў сувязі з заражэннем COVID-19. Па меркаванні боку абвінавачання, Чынават зняслаўў манархію ў каментарыях, зробленых у Сеуле ў маі 2015 года. У інтэрв'ю газеце «Часон ільба» ён заявіў, што члены Таемнага савета (дарадчага органа пры каралі Тайланда) падтрымалі дзяржаўны пераварот 22 мая 2014 года, у выніку якога быў зрынуты ўрад на чале з яго малодшай сястрой Інглак Чынават.

## Вялікабрытанія сутыкнулася з самай складанай фінансавай праблемай за 70 гадоў

Наступнаму ўраду Вялікабрытаніі трэба будзе вырашыць найскладанейшую праблему з напаўненнем дзяржаўнага бюджэту, паведаміла агенцтва Bloomberg. «Задача, якая стаіць перад пераможцам на выбарах, больш сур'ёзная, чым тыя, з якімі сутыкаліся ўрады з 1950-х гадоў. Незалежна ад таго, хто пераможа, яго чакаюць высокія даўгі, высокія працэнтныя стаўкі і нізкія тэмпы росту», — адзначыла агенцтва. На думку Інстытута фіскальных даследаванняў (IFS), для напаўнення бюджэту новаму ўраду давядзецца або скарачаць выдаткі на дзяржаўныя паслугі, што будзе балюча, або павысіць падаткі, якія ўжо блізкія да 80-гадовага максімуму. Альтэрнатыўнай можа быць павелічэнне запазычанняў, што ўскладніць стабілізацыю ўзроўню дзярждоўгу.

## Амерыканскую падлодку часоў Другой сусветнай знайшлі на дне Паўднёва-Кітайскага мора

Амерыканскую падводную лодку USS Harder часоў Другой сусветнай вайны знайшлі на дне Паўднёва-Кітайскага мора. Аб знаходцы паведаміла ТАСС са спасылкай на партал Business Insider. Паводле даных крыніцы, судна захавалася дастаткова добра. Не абышлося і без разбурэнняў, аднак яны закранулі толькі баявую рубку карабля. Як устаноўлена, падводная лодка з 79 вайскоўцамі на борце затанула 24 жніўня 1944 года. Дакладна вызначыць назву падлодкі дапамаглі даныя арганізацыі Lost 52. Яна займаецца пошукам 52 амерыканскіх падлодак, затанулых у той перыяд, піша Business Insider.

Кніжны свет

# БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА ЯДНАЕ

**Ва Уфе (Рэспубліка Башкартастан) на пляцоўцы II Міжнароднага кніжнага кірмашу «КІТАП-БАЙРАМ» прайшла прэзентацыя толькі што выдадзенай «Анталогіі сучаснай беларускай літаратуры». Выданне пабачыла свет у серыі «Паліца Садружнасці».**

На конкурсе «Кніга года на Зямлі Урал-Батыра» за гэты анталагічны зборнік Башкірскае выдавецтва «Кітап» імя Зайнаб Біішавай атрымала першы прыз у намінацыі «Выданне, якое робіць унёсак у дыялог культур».

Ініцыятар стварэння анталогіі твораў беларускіх паэтаў і празаікаў — старшыня Саюза пісьменнікаў Башкартастана вядомы празаік Айгіз Баймухаметаў. Ён двойчы прыязджаў у Беларусь, збіраў творы, якія павінны былі ўвайсці ў калектыўную кнігу, раіўся з беларускімі калегамі. Укладальнікам выступіла празаік Танзіля Даўлетбердзіна.

Удзельнічалі ў прэзентацыі і госці з Беларусі. Сярод іх — старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Таццяна Дзямідовіч. На сустрэчы на кніжным кірмашы ішла размова і пра тое, што ў найбліжэйшы час у Мінску пабачыць свет анталогія сучаснай башкірскай літаратуры ў перакладзе на беларускую мову. Дадзеныя праекты нараджаюцца ў выніку дзеяння Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж пісьменніцкімі арганізацыямі Беларусі і Башкартастана, якое было заключана на папярэднім кніжным кірмашы «Кітап-Байрам» у 2023 годзе.

**Мацвей ПАШКОЎСКІ.**

Думкі ўслых

## Калі б твой дзень быў каляровы?..



«Мой сын бегае за мной як хвосцік, — скардзіцца мама чатырохгадовага Даніка. — Збірае пазл — просіць, каб я сядзела побач і глядзела, гуляе ў машынкі — трэба, каб «бібікала» разам з ім; калі не пачытаю ўслых казку перад сном, не засне». Майму Сымону пяць — і тая ж сітуацыя: усё хоча рабіць разам. Пераказала тую размову сястры. А Наташа кажа: «Радуйцеся і атрымлівайце асалоду ад таго, што маеце. Хутка гэтага ўсяго не будзе... Вось майму Мацвею ўжо восьмы год пайшоў. Раней кніжку прасіў пачытаць. А цяпер мама для гэтага не патрэбная, бо сам навучыўся. Ідзе ў свой пакой і чытае тое, што сам хоча. Прыходзіць са школы — асвойвае новы від кубіка Рубіка, вучыцца жангліраваць па ролiку на YouTube. Я зразумела, што калі цяпер упусціць момант, то кропак судакранання з Мацвеем з кожным годам будзе станавіцца ўсё менш і менш».

*Каб не страціць кантакт з сынам, мая сястра вырашыла дзейнічаць неадкладна. Раз на тыдзень яна возіць Мацвея вучыцца іграць на гітары. «Усе бацькі, — кажа, — чакаюць сваіх дзяцей на калідоры. Я ж прысутнічаю на занятку і засвойваю музычную грамату разам з сынам, дома з задавальненнем развучваю з ім пройдзеныя акорды. Акрамя таго, заўважыла, што Мацвей любіць катацца на веласіпедзе. Раней ён наразаў кругі па стадыёне, а я сядзела на лавачцы і назірала. Але адчувала, што гэта не спрыяе наладжванню больш блізкіх адносін з сынам. І вось днямі я прапанавала мужу купіць веласіпеды і нам з ім, каб на выхадных ладзіць сямейныя паездкі. Гэта была цудоўная ідэя. У нас з сынам і мужам з'явілася яшчэ адна агульная справа і тэма для размоў».*

*З нараджэннем сына ў маім жыцці з'явілася шмат кніг і відэалекцый па псіхалогіі. Яны дапамагаюць своечасова заўважаць свае ўпушчэнні ў выхаванні і штосьці карэкціраваць. Некаторыя мамы і таты лічаць, што выконваюць свой бацькоўскі доўг, укалваючы на рабоце і забяспечваючы дзіця ўсім неабходным. Але, сцвярджаюць псіхолагі, гэтыя намаганні пакрываюць толькі базавыя патрэбы, але не закранаюць душу. Дзіця можа адчуваць удзячнасць за «развівашкі», абноўкі ды цацкі. Але любоў, адданасць і давер нараджаюцца не так. Менавіта таму трэба больш размаўляць са сваімі дзецьмі на розныя тэмы (не толькі пра адзнакі ў школе; не варта злоўжываць і бясконцымі ўказаннямі, забаронамі, крытыкай і кантролем). Напрыклад, у блогу сямейнага псіхолага Вольгі Пекун сустрэла прыблізны спіс «Што спытаць у дзіцяці, каб зблізіцца з ім?» Серад пытанняў: «Што цябе здзівіла ў апошнія дні? Які сябар прымушае цябе больш за ўсё смяяцца? Калі б твой дзень быў каляровы, якога б ён быў колеру? Табе падабаецца дзяліцца з іншымі дзецьмі? Што для цябе важна ў нашых адносінах? Якое тваё любімае месца ў доме? Які самы шчаслівы момант, які ты памятаеш са сваёй сям'ёй? А які самы дрэнны? Калі б ты быў супергероем, то якім? Куды б ты накіраваўся ў падарожжа?» Днямі я задала іх свайму сыну і даведалася пра яго шмат цікавага. Паспрабуйце і вы.*

*...1 чэрвеня адзначаецца Міжнародны дзень абароны дзяцей. Дык вось, галоўнае, ад чаго сёння трэба абараняць хлопчыкаў і дзяўчынак, — гэта ад недахопу бацькоўскай увагі. І справа зусім не ў колькасці, а ў якасці сумесна праведзенага часу. Нам, татам і мамам, варта памятаць, што нельга гуляць з дзіцем у дыназаўраў, думаючы пра свае нявырашаныя праблемы. Гэта не працуе. Важна знаходзіць час на сумесныя справы, пры гэтым цалкам быць са сваім малым, глядзець яму ў вочы і зацікаўлена слухаць, што ён гаворыць. Інакш паступова наша месца зоймуць мабільныя тэлефоны ды планшэты... Негатыўны прыклад навідавоку. У мужа прыяцелькі ёсць сын ад першага шлюбу. Ён праз выхадныя прыязджае да таты ў госці і два дні запар бязвылазна сядзіць у сваім пакоі, гуляе ў камп'ютарныя гульні. Калі ж мужчына па парадзе жонкі прапанаваў сыну пакідаць мяч у баскетбольнае кальцо, дык падлетак сказаў, што яму гэта нецікава...*

*Мяне ж натхняюць зусім іншыя, станоўчыя, прыклады. У прыватнасці, вельмі прыемна назіраць, як цымбалістка Ала Віктараўна ходзіць са сваімі ўжо дарослымі дзецьмі ў кіно, тэатр, на выставы, сем'ямі вандруюць па Беларусі. Ім цікава разам, бо ў іх ёсць агульныя інтарэсы, тэмы для размовы, моцныя традыцыі. А галоўнае — узаемаразуменне і ўзаемападтрымка. Цёплыя адносіны — справа не аднаго дня, яны, кажа жанчына, выбудоўваюцца па цаглінцы, год за годам, пачынаючы з самага нараджэння дзетак.*

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**


Сямейная газета

Выпуск № 9 (234)


Тыя, хто побач

# «КАЛІ ТЫ БАГАЦЕЙШЫ, ДАПАМАЖЫ ІНШАМУ»

**Якія прынцыпы закладвае ў выхаванне сваіх дзяцей лаўрэат рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года» Надзея ЛАСТОЎСКАЯ**



**НАДЗЕЯ Уладзіславаўна не проста жанчына-переможца. Яна ўвайшла ў лік найлепшых матуль у намінацыі «Матчына слава». Гэта значыць, выхавала дастойных і паспяховых дзяцей. Праўда, сустрэцца з дзецьмі ў мяне не атрымалася — яны раз'ехаліся з роднага дома. Хтосьці жыве ў Гродне, хтосьці — у Мінску. Там і працуюць, і вучацца. А з Надзеяй Уладзіславаўнай мы сустрэліся ў яе другім доме — Воранаўскай сярэдняй школе, дзе яна працуе настаўніцай вось ужо 27 гадоў.**


*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*


Дарослым на заметку

# АСЦЯРОЖНА — ЛЕТА...

## Аб чым бацькам неабходна пагаварыць са сваімі дзецьмі напярэдадні летніх канікул?



**ПРАЗ пару дзён наступіць самы доўгачаканы перыяд для многіх жыхароў нашай краіны. Для юных беларусаў — дакладна. Летнія канікулы — магчымасць не толькі перадыхнуць ад школьных урокаў і выверанага распарадку дня, але і рабіць тое, што на працягу навучальнага года было не дазволена або абмежавана часам: катацца на веласіпедзе, купацца ў вадаёме, бавіць час з сябрамі за самымі рознымі заняткамі.**

З пачаткам лета на своеасаблівую перадышку ад пэўных абавязкаў, у першую чаргу звязаных са школай, разлічваюць і бацькі. Аднак далёка не ўсе з іх могуць забяспечыць поўны кантроль над сваімі дзецьмі на працягу ўсяго канікулярнага перыяду. Хтосьці адпраўляе нашчадкаў у летнік, у кагосьці ёсць надзейныя памочнікі ў якасці бабуль і дзядуль, у некаторых дзеці вымушаны заставацца адны дома, пакуль бацькі знаходзяцца на рабоце. Які б сцэнарый правядзення летніх канікул дарослыя ні падрыхтавалі для сваіх дзяцей, першае, што яны павінны зрабіць, — расказаць аб магчымых небяспечных сітуацыях і, самае галоўнае, патлумачыць, як сябе паводзіць, калі іх не ўдалося пазбегнуць.

### МАЛЫЯ — У ПОЛІ ЗРОКУ

Пачнём з самых маленькіх. Найважнейшае правіла для бацькоў тых, хто пачаў рабіць свае першыя крокі, — стварыць бяспечнае асяроддзе. Напрыклад, абмежаваць спецыяльнымі заглушкамі доступ да разетак і электрапрыбораў, вострых вуглоў, вады.

«Бацькі павінны забяспечыць пастаянны кантроль за сваімі малымі дзецьмі, — звяртае ўвагу **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Трэба апусціцца на ўзровень вачэй дзіцяці і паглядзець, што яму відаць. Так можна ўбачыць тое, што можа ўяўляць небяспеку для малога. Варта выключыць са звычак матуль і такія факты, як выбяганне ў краму або адлучэнне на хвіліну да суседкі. На жаль, за гэта імгненне можа здарыцца непапраўнае. І тады такі сцэнарый перайграць будзе немагчыма».

Па прыклады далёка хадзіць не трэба. У чэрвені мінулага года ў хатнім басейне на тэрыторыі прыватнага дома ў Мінскім раёне патанула паўтарагадовая дзяўчынка. Увесь дзень шматдзетная сям'я займалася будоўляй, у пэўны момант дзіця знікла з поля зроку бацькоў. Заўважыўшы адсутнасць дзяўчынкі, бацька з маці сталі яе шукаць. Знайшлі без прыкмет жыцця ў каркасным басейне. Басейн быў абсталяваны лесвіцай, якой дзіця змагло самастойна скарыстацца.


*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

# АСЦЯРОЖНА — ЛЕТА...



*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Перш чым устанавіць або надзьмуць басейн, упрыгожыць уласны падворак дэкаратыўнай сажалкай, варта падумаць аб тым, ці будзе гэта бяспечна для юных жыхароў або гасцей гэтага дома. У лютым 2023 года гульня на сажалцы ў адной з вёсак Жабінкаўскага раёна стала апошняй для двух братоў. Як высветлілася, хлопчыкі шасці і васьмі гадоў спрабавалі праверыць трываласць лёду на штучным вадаёме. Пад іх вагой лёд зламаўся, і дзеці апынуліся ў вадзе. На жаль, самастойна выбрацца браты не змаглі...

Небяспечным для жыцця можа стаць і ванны пакой. Дастаткова ўсяго на хвіліну выйсці, як можа здарыцца непапраўнае. Так летась адбылося ў Салігорску. Маладая маці купала свайго паўтарагадовага сына. Літаральна некалькі секунд, пакуль жанчына адсутнічала ў ваннай, хапіла, каб дацягнуцца за цацкамі і скінуць у ваду фен, падключаны да разеткі. Хлопчык загінуў ад удару токам.

Нельга дапусціць і такую сітуацыю, калі дзіця вас зачыніць у пакоі ці закрыецца знутры кватэры. Будучы бескантрольным, яно і за запалкі можа схапіцца, і акно адчыніць... Хто ведае, чым магла скончыцца нядаўняя сітуацыя ў Мар'інай Горцы, дзе двухгадовае дзіця зачыніла маці на балконе, калі б своечасова не паспелі ратавальнікі.

## НА ВАДАЁМ — ТОЛЬКІ З ДАРОСЛЫМІ!

Прычынай трывогі многіх бацькоў з'яўляецца і вялікая вада. Асабліва ў летні перыяд. Тым больш тады, калі побач з хатай бабулі або дзядулі, дзе летам адпачываюць дзеці, знаходзіцца возера ці рэчка. І тут парада ратавальнікаў такая — знаходзіць час наведваць вадаём разам са сваімі дзецьмі, калі яны гэтага просяць. Іначай непаўналетнія пойдуць да вады самастойна, не папярэдзіўшы вас аб гэтым. Як паказваюць трагічныя сітуацыі з дзецьмі на вадзе, дарослыя не ведаюць аб тым, дзе бавяць час іх нашчадкі.

> Такіх сітуацый, на жаль, нямала. Адна з іх у ліпені мінулага года здарылася ў Магілёўскім раёне. З ратавальнікамі звязалася жанчына, якая паведаміла аб тым, што ў Магілёўскім раёне на беразе возера знайшлі рэчы яе сына 2015 года нараджэння. Аб яго месцазнаходжанні маці не ведала. Адразу па прыбыцці да месца выкліку ратавальнікі нікога не знайшлі. Аднак на тое, што здарылася непапраўнае, указвалі дзіцячыя рэчы, пакінутыя на беразе вадаёма. Пазней вадалазы МНС з-пад вады выцягнулі хлопчыка без прыкмет жыцця. Як удалося ўстанавіць, пацярпелы купаўся ў возеры разам са стрыечным братам. Дарослых побач з імі не было.

Практычна ўсе трагічныя выпадкі з дзецьмі на вадзе падобныя адзін да аднаго. І, напэўна, многіх з іх можна было б пазбегнуць, каб побач з дзецьмі на вадаёме былі бацькі ці іншыя дарослыя, хто за іх адказвае.

## З АГНЁМ НЕ ЖАРТУЮЦЬ

Задача бацькоў — паклапаціцца і аб пажарнай бяспецы ва ўласным доме. Абсталяваць памяшканне пажарнымі апавяшчальнікамі можна без вялікіх намаганняў і сур'ёзных грашовых затрат. Затое гэты невялічкі прыбор можа выратаваць самае дарагое, што ў вас ёсць, — дзяцей. Патлумачце ім, чым для іх могуць скончыцца гульні з запалкамі, эксперыменты з агнём.

> Дзіцячае свавольства з агнём у пачатку мінулага лета прывяло да ўзгарання саломы ў Смалявіцкім раёне. Прычынай пажару стала гульня дзяўчынак-падлеткаў з запальнічкай. Побач з саломай яны падпалілі пакет, ад якога і распаўсюдзіўся агонь. Самастойна патушыць узгаранне ў іх не атрымалася. А колькі «эксперыментаў» з агнём непаўналетнія чэрпаюць з сацыяльных сетак, а потым спрабуюць паўтарыць самастойна! Пры гэтым не ўлічваюць, што відэаролік можа быць зроблены з дапамогай відэамантажу, з прымяненнем спецэфектаў.

«Варта кантраляваць знаходжанне дзяцей падалей ад вогнішча, не дапускаць самастойнага выкарыстання імі адкрытага агню. Асабліва гэта актуальна пры смажанні шашлыкоў, — заўважае Анастасія Швайбовіч. — Пачасціліся выпадкі, калі дзеці атрымліваюць траўмы пры выкарыстанні дарослымі лёгкаўзгаральных і гаручых вадкасцяў, якія ні ў якім разе нельга прымяняць для распальвання вогнішча. Увогуле, захоўвайце іх у недаступным для дзяцей месцы».

У ліпені мінулага года ў Аршанскую гарадскую бальніцу з апёкамі 40 % цела паступіў хлопчык 2014 года нараджэння. Маці разам з дзецьмі вырашыла прыгатаваць ежу на вогнішчы. У той час, як жанчына пераключыла сваю ўвагу на іншае, яе сын вынес з хаты ёмістасць з бензінам. Сястра хлопчыка ўзяла з мангала палку і апусціла яе ў бензін — адбылася ўспышка. На хлопчыку загарэлася адзенне. На шчасце, падаспела маці, але без дапамогі медыкаў не абышлося.

## КАР'ЕРЫ І БУДОЎЛІ АБЫХОДЗІЦЬ

Патлумачце дзецям і тое, што будоўля — не дзіцячая пляцоўка, дзе можна гуляць. Важна данесці, каб яны пазбягалі такіх небяспечных месцаў, як вышкі, закінутыя будынкі, гарышчы, яры, кар'еры. І тут, на жаль, не без сумных прыкладаў. У мінулагоднім ліпені гульня на кар'еры ў Быхаве скончылася смерцю дзіцяці 2013 года нараджэння. Трое дзяцей гулялі на кар'еры, які на момант здарэння не эксплуатаваўся. Аднаго з хлопчыкаў засыпала пяском. Двое яго сяброў пабеглі клікаць на дапамогу бацькоў, але было ўжо позна...

> Летась на будоўлі ў Лідзе загінула і чатырохгадовае дзіця. На выхадных хлопчык разам са сваёй сям'ёй гасцяваў у бабулі. Трагедыя здарылася на вуліцы, куды ён пайшоў гуляць разам з суседскімі дзецьмі. Месца для гульні выбралі небяспечнае — каля цеплавых труб, якія знаходзіліся на ўзвышшанасці і не былі замацаваны. Старэйшыя дзеці залезлі на адну з труб і пачалі качацца. У пэўны момант яна пакацілася і заціснула чатырохгадовае дзіця. Па дарозе ў бальніцу хлопчык памёр.

## ПАЗБЯГАЙЦЕ АДЧЫНЕНЫХ ВОКНАЎ...

Колькі людзей ні папярэджвай аб небяспецы адчыненых вокнаў, калі ў сям'і выхоўваюцца малыя дзеці, з году ў год трагедыі паўтараюцца. Днямі, напрыклад, з акна выпаў шасцігадовы хлопчык у Ваўкавыскім раёне. Пашанцавала, што сям'я жыве на першым паверсе. Аднак і такой вышыні хапіла, каб атрымаць шматлікія траўмы. У момант трагедыі, акрамя дзіцяці, дома нікога не было: мама выйшла ў краму. У гэты час малалетні ўбачыў праз акно дзяцей, залез на падаконнік, абапёрся на маскітную сетку і ўпаў уніз.

«Калі адчыняеце вокны, рабіце гэта ў рэжыме праветрывання, — рэкамендуе Анастасія Швайбовіч. — Спадзявацца на маскітную сетку не варта: яна абсалютна не ўтрымлівае вагі нават самага маленькага дзіцяці, не кажучы ўжо пра старэйшых. Каб увогуле быць спакойнымі на гэты конт, устанавіце на вокны замкі — у любы момант вы можаце зачыніць іх на ключ».

Не дазваляйце дзецям самастойна пераходзіць дарогу, пакуль не навучыце іх рабіць гэта правільна. Патлумачце, што асцярожнымі варта быць і ў дварах. Ніякі мяч або цацка не вартыя таго, каб кідацца за імі пад машыну. Важны момант, на які неабходна звярнуць увагу непаўналетнім удзельнікам дарожнага руху, — праслухоўванне музыкі праз навушнікі і гаджэты. Пры перасячэнні праезнай часткі трэба дастаць з вушэй навушнікі, пакласці тэлефон у сумку або кішэню. Адмовіцца ад праслухоўвання музыкі праз навушнікі варта і падчас перасячэння чыгуначных шляхоў, прагулак каля чыгункі. Многія трагедыі здараюцца менавіта з-за такога захаплення непаўналетніх, якое адцягвае іх увагу ад галоўнага. Катэгарычна забараняецца перабягаць чыгуначныя шляхі перад цягнікам, які ідзе. Ісці ўздоўж чыгункі неабходна на адлегласці не бліжэй як пяць метраў ад крайняга рэльса. Таксама важна папярэдзіць дзяцей: ніякіх гульняў на чыгунцы, а таксама сэлфі на фоне цягніка, які набліжаецца!

## ЗГУБІЦЦА Ў ЛЕСЕ МОЖА КОЖНЫ

> Неўзабаве з'явяцца ягады і грыбы — і людзі, у тым ліку дзеці, паспяшаюцца ў лес. Як паказвае практыка, згубіцца ў лясным масіве можа нават самы вопытны грыбнік, не кажучы ўжо пра дзіця. У пачатку вясны звыш 600 чалавек удзельнічала ў пошуках дзвюх малых дзяўчынак з вёскі Рыбцы Пухавіцкага раёна. Двухгадовая і чатырохгадовая сястрычкі не прыйшлі ўвечары дадому. Ноччу іх знайшлі ў лясным масіве.

Лес — гэта тое месца, якое патрабуе добрай падрыхтоўкі і дарослых, і дзяцей. «Нават калі вы вельмі добра арыентуецеся ў лесе, гэта не сведчыць аб тым, што вы не можаце заблукаць, — заўважае Анастасія Швайбовіч. — Многія людзі, якіх шукаюць ратавальнікі, пачынаюць са слоў: «Я ўсё жыццё хаджу па гэтым лесе...»

Калі падазраяце, што дзеці згубіліся, адразу тэлефануйце ў экстранныя службы. Паведаміце, дзе і ў колькі гэта адбылося, назавіце прыкметы дзяцей: апішыце іх знешнасць, раскажыце, у што яны былі апрануты і інш. Калі жывяце побач з лесам або ён — у крокавай даступнасці там, дзе вашы дзеці праводзяць выхадныя або канікулы, — абавязкова патлумачце сваім выхаванцам, што лес — не месца для гульні. Раскажыце, якія небяспекі могуць чакаць іх у лесе, навучыце дзіця, што трэба рабіць, калі яно згубілася.

## «101» І «112» — ТЭЛЕФОНЫ РАТАВАЛЬНІКАЎ

Калі ваша дзіця дастаткова дарослае, каб самастойна знаходзіцца дома, вы павінны ведаць, чым яно займаецца, калі гуляе, то з кім. У такім выпадку бацькі павінны быць на сувязі са сваімі нашчадкамі. Не лішнім будзе прайграць сітуацыю, калі дзіця адно дома і незнаёмыя людзі патэлефанавалі ў дзверы. Алгарытм паводзін просты: ні ў якім разе не адчыняць дзверы і не падаваць выгляду, што ты адзін дома. І яшчэ вельмі важная дэталь — ваша дзіця павінна ведаць свой адрас, тэлефон, а таксама тэлефоны ратавальнікаў («101» і «112») і алгарытм іх выкліку: патэлефанаваць, сказаць, што адбылося, дзе вы знаходзіцеся, назваць сваё імя і прозвішча, нумар тэлефона.

> «Мала проста забараніць нешта свайму дзіцяці, — рэзюмуе Анастасія Швайбовіч. — Калі малому кажаш «нельга», воляй-няволяй яно хоча парушыць гэтую забарону і высветліць, што ж будзе, чаму нельга. Бацькі павінны спрацаваць на апярэджанне: не проста сказаць, што нельга гуляць з запалкамі, а патлумачыць, што можна атрымаць апёк, будуць балець пальчыкі, давядзецца ехаць у бальніцу... Мы, дарослыя, чамусьці думаем, што дзеці ўсё разумеюць. Насамрэч, гэта не так. Расказваць аб небяспечных сітуацыях трэба простымі словамі».

У любым выпадку, дзе б ні праводзілі летнія канікулы вашы дзеці, адказнасць за іх у першую чаргу ляжыць на бацьках. Гэта датычыцца і адпачынку ў бабуль-дзядуль. Калі вы разумееце, што вашым пажылым бацькам не па сілах глядзець за ўнукамі, варта падумаць аб іншым сцэнарыі адпачынку дзяцей. Рыхтуючы ім цікавае і карыснае баўленне часу, у першую чаргу паклапацьцеся аб тым, каб адпачынак вашых нашчадкаў быў бяспечны.

**Вераніка КАНЮТА.**

# «КАЛІ ТЫ БАГАЦЕЙШЫ, ДАПАМАЖЫ ІНШАМУ»

## КОНКУРС. «УСЁ ПАЧАЛОСЯ З СЯРЭБРАНАГА ВЯСЕЛЛЯ»

А канкрэтна — з газетнага артыкула ў мясцовай прэсе. Летась гісторыя 25-гадовага сямейнага жыцця шматдзетнай сям'і зацікавіла старшыню Воранаўскай раённай арганізацыі «Беларускі саюз жанчы» Алену Ястрэмскую, і яна прапанавала Надзеі ўзяць удзел у конкурсе «Жанчына года — 2023» у намінацыі «Мацярынская слава».

Напачатку быў завочны тур, успамінае суразмоўніца. У аргкамітэт даслалі анкету, невялікае эсэ пра сям'ю і кароткі відэаролік. Пасля адбору на мясцовым узроўні матэрыялы трапілі на разгляд рэспубліканскага журы. Надзея з нецярпеннем чакала канчатковага выніку. І вось — званок ад саюза жанчын. Яна ў ліку лаўрэатаў рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года — 2023». Адзіная на ўвесь Воранаўскі раён.

— Я тады вельмі ўсхвалявалася, — кажа Надзея. — Было адчуванне вялікай радасці. Хоць ніколі не думала, што можа быць узнагарода за выхаванне дзяцей. Мне здавалася, што мае дзеці — гэта мае пытанні. Але і гэта праца заўважана і ацэнена дзяржавай.

Жанчына прызнаецца, што льготы для шматдзетнай сям'і сапраўды адчувальныя. З дапамогай ільготнага крэдыту набылі дом, дзеці бясплатна харчаваліся ў школе, бясплатна ездзілі ў аздараўленчыя летнікі. Але, каб атрымаць узнагароду, калі яны выраслі і вызначыліся ў жыцці, — такога мая суразмоўніца і прадбачыць не магла. Пасля віншаванняў сямейнікаў пачала збірацца ў сталіцу. Здаецца, жанчына і сёння жыве тымі яскравымі ўспамінамі. Хоць нічога дзіўнага — мінула яшчэ мала часу пасля падзеі. Да таго ж і ўспомніць ёсць што.

**Надзея кажа, што ёй як настаўніцы было вельмі прыемна атрымаць віншаванні ад міністра адукацыі — менавіта Андрэй Іванец вітаў пераможцаў намінацыі «Мацярынская слава».**

— Мы наведалі храм з манастыром, была экскурсія па горадзе, у аўтобусе ехала побач з маці касманаўта Алега Навіцкага, было шмат паважаных і заслужаных жанчын. Але ўсе вельмі простыя, ветлівыя людзі. Для мяне гэта паездка стала сапраўднай аддушынай, зменай абстаноўкі. Мы, жанчыны, адчулі столькі ўвагі да нас з боку дзяржавы! — расказала аб сваіх уражаннях суразмоўца.

Вядома, кульмінацыяй мерапрыемства стала цырымонія ўшанавання пераможцаў. Надзея кажа, што ёй як настаўніцы было вельмі прыемна атрымаць віншаванні ад міністра адукацыі — менавіта Андрэй Іванец вітаў пераможцаў намінацыі «Мацярынская слава». Потым быў вельмі шыкоўны торт, які на фота амаль роўны з такой жа шыкоўнай Надзеяй. «Прыйшлося зрабіць прычоску і купіць новую сукенку. Маці сказала, каб была абавязкова ў сукенцы. Я заўсёды да яе прыслухоўваюся», — пракаментавала адпаведны здымак Надзея Ластоўская.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

## СЯМ'Я. «ВАЖНА СТВАРЫЦЬ ДАВЕРЛІВЫЯ АДНОСІНЫ»

Замуж Надзея выйшла па сённяшніх мерках рана — у 21 год. Разам з мужам Іванам нарадзілі траіх дзяцей. Хатнія клопаты па іх выхаванні амаль цалкам ляжалі на плячах жонкі. Муж таксама не заставаўся ўбаку, але пасада старшыні Воранаўскага раённага суда патрабавала даволі шмат часу. Ды і Надзея спакойна ставілася да хатніх спраў. А выхаваўчы працэс вяла па такім прынцыпе, як і яе маці.



— Я сваіх дзяцей вучыла па маміным рэцэпце: добрасумленна ставіцца да сваіх абавязкаў. Дзе б яны ні працавалі, на якім бы месцы ні былі. Калі чалавек расце адказным за свой лёс, ён і ведамі авалодае, і навуку асвоіць, — упэўнена суразмоўніца.

— Ці азначае гэта, што вашы дзеці раслі ў строгасці, пад няспынным кантролем? — узнікае лагічнае пытанне.

Аказалася, што не зусім так. Напрыклад, Надзея не рабіла з дзецьмі дамашніх заданняў.

— Павінна быць мяжа, — тлумачыць яна. — У некаторых пытаннях я давала самастойнасць, урокі з імі не рабіла. У малодшых класах дзеці ніколі не пісалі на чарнавік, каб потым перапісаць у чысты сшытак. Малому дзіцяці гэта цяжка. Мы так не рабілі.

Што адыграла сваю ролю: такі падыход ці гены бацькоў, але ўсе дзеці вучыліся паспяхова. Старэйшая дачка Аляксандра — залатая медалістка, пераможца рэспубліканскай алімпіяды па грамадазнаўстве, уключана ў банк даных адоранай і таленавітай моладзі, стыпендыят прэміі спецыяльнага фонду Прэзідэнта. Скончыла юрыдычны факультэт ГрДУ імя Я. Купалы, там жа працуе выкладчыкам і займаецца навуковай дзейнасцю. Мае шраг публікацый, распрацовак, бярэ ўдзел у рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцыях.

**Яна не ўтойвае, што бываюць складаныя моманты. І з дзецьмі іншы раз не ўсё гладка. Але маці радуе той факт, што яны заўсёды падзеляцца з бацькамі сваімі праблемамі.**

Сярэдні сын Аляксей — таксама залаты медаліст, пераможца рэспубліканскай алімпіяды па матэматыцы. Цяпер студэнт фізіка-тэхнічнага факультэта ГрДУ, будучы інжынер-робататэхнік. Асвойвае моўшн-дызайн — модны кірунак анімацыйнай графікі.

Малодшы Яраслаў марыць стаць музыкантам. Дарэчы, сёлета вытрымаў даволі сур'ёзны конкурс і працягвае вучобу ў сталічным музычным каледжы імя Глінкі па класе саксафона. Падчас вучобы ў Воранаўскай музычнай школе быў пераможцам рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў «Крыштальны васілёк», «Спадчына», «Brand New Jazz», «Свята саксафона» і многіх іншых. Удзельнік тэлешоу для школьнікаў «Я ведаю».

— У маёй намінацыі «Мацярынская слава» менавіта заслугі дзяцей адыгралі асноўную ролю. Дзеці сфарміраваны, хоць чалавек можа ўдасканальвацца ўсё жыццё. Думаю, што асноўныя прынцыпы закладзены. Яны імкнуцца рабіць тое, да чаго іх душа ляжыць. Таму і вынікі адпаведныя, — упэўнена жанчына.

Між тым яна не ўтойвае, што бываюць складаныя моманты. І з дзецьмі іншы раз не ўсё гладка. Але маці радуе той факт, што яны заўсёды падзеляцца з бацькамі сваімі праблемамі, а іншы раз — і сакрэтамі.

— Думаю, не будуць утойваць, калі здарыцца якая-небудь недарэчная сітуацыя. Усялякае бывае. Будзем старацца вырашаць пытанне з разумнага пункту гледжання. Я і цяпер ведаю пра іх захапленні, нават каму хто падабаецца. Сын часам раіцца, што падарыць сваёй дзяўчыне. І з татам таксама ёсць добры кантакт. Ён можа маўчаць, але пры неабходнасці заўсёды дапаможа знайсці выхад са складанага становішча. Дзеці павінны давяраць бацькам, як і бацькі — дзецям. Вельмі важна, каб быў давер, інакш у сям'і няма сэнсу, — лічыць наша гераіня.



Мама–лаўрэат.

**«Я сваіх дзяцей вучыла па маміным рэцэпце: добрасумленна ставіцца да сваіх абавязкаў. Дзе б яны ні працавалі, на якім бы месцы ні былі».**

Для яе сямейныя каштоўнасці — сэнс жыцця. Такая традыцыя закладвалася і ў яе сям'і, дзе стараліся жыць па біблейскіх запаветах. Гэта аб'ядноўвае сямейнікаў, ды і наогул душа напаўняецца нечым добрым, яна не пустая. Так павялося, што самыя значныя святы — Каляды, Новы год, Вялікдзень, дні нараджэння — тут праводзяць усе разам, прычым збіраюцца ў суседняй вёсцы, у радавым гняздзе Надзеі — у яе матулі. Жанчына хоча бачыць сваіх дзяцей такімі ж згуртаванымі, як і яна са сваімі братамі.

— Стараюся, каб мае дзеці былі дружныя паміж сабой. Вядома, не ўсе будуць жыць аднолькава, хтосьці будзе багацейшы, хтосьці — не такі забяспечаны. Але не трэба кідаць адно аднаго, а прыходзіць адно аднаму на дапамогу, — агучвае свой запавет субяседніца.

## ЗАХАПЛЕННІ. «ПЧАЛЯРСТВА, ФІТНЕС, КУЛІНАРЫЯ — МАЯ АДДУШЫНА»

Калі я ўбачыла Надзею ў школьным калідоры, нават не паверыла, што яна маці траіх дарослых дзяцей. Мяне сустрэла маладжавая і вельмі стройная жанчына. Для гутаркі выбралі кабінет дамаводства. Гэта адзін з прадметаў, які вядзе мая суразмоўніца. Праўда, прызнаецца, што некалі хацела стаць урачом, але маці адгаварыла — маўляў, вельмі доўга трэба вучыцца, і параіла паступіць у Ваўкавыскае педагагічнае вучылішча. А потым быў працяг у ГрДУ імя Я. Купалы. Атрымаўшы вышэйшую адукацыю, стала выкладаць гісторыю. За плячыма — ужо 27 гадоў працоўнага стажу. Кажа, што не шкадуе аб сваім выбары, бо і дзяцей, і работу сваю вельмі любіць. Падрыхтавала нямала вучняў, якія сталі пераможцамі алімпіяд па гісторыі, атрымлівалі перамогу ў конкурсах дэкаратыўна-прыкладной творчасці, бралі ўдзел у літаратурна-краязнаўчых форумах і канферэнцыях. Як педагог, лічыць, што трэба ісці ў нагу з сённяшнім пакаленнем.



Хлеб уласнай выпечкі.

— Дзеці сёння іншыя, не такія, як былі на пачатку маёй працы. Вядома, значны час у тэлефонах сядзяць, але іх можна адцягнуць, зацікавіць. Дарослыя таксама павінны быць мабільнымі, як і яны. Мы не можам стаяць на месцы, — дзеліцца сваімі думкамі Надзея.

А сама яна не можа сядзець без працы. «А як жа адпачынак? — пытаюся ў яе. — Выезды на мора ці ў іншыя падарожжы?» Аказваецца, Надзея не фанат круізаў і палётаў. Яе запаветнае жаданне — рэалізаваць свой творчы і кулінарны патэнцыял. Яна — майстар па выпечцы хлеба і розных кандытарскіх далікатэсаў. Кажа, што карыстаецца бабулінымі сакрэтамі замесу цеста. Выпякае хлеб, як правіла, калі ўсе збіраюцца разам.

— Калі бачу, што хлеб у сталоўцы кідаюць, заўсёды сваім вучням кажу: хлеб кідаць — гэта грэх. Асабліва мой бацька ставіўся да хлеба з павагай, ды і ўся сям'я. Можа, таму і я стала хлеб пячы, — разважае жанчына.

**Ніводнае свята не абыходзіцца без яе раскошных тартоў, піражных, іншых далікатэсаў. Пры гэтым мае час і на рукадзелле, і на агарод, і на фітнес.**

Увогуле, бацькоўскі дом для яе — гэта месца спакою і сілы. Пасля таго як не стала бацькі, занялася з братамі пчалярствам. Надзея радуецца, што ўдалося захаваць гэту сямейную традыцыю, якая падтрымліваецца чатырма пакаленнямі. Пры гэтым удзельнічае ў конкурсах і фестывалях, прысвечаных пчалярству, даследуе праблемы негатыўнага ўздзеяння на пчол.

Можна толькі пазайздросціць колькасці захапленняў маёй суразмоўніцы. У гэтым спісе ёсць месца для таго, каб парадаваць і сямейнікаў, і сябе. Ніводнае свята не абыходзіцца без яе раскошных тартоў, піражных, іншых далікатэсаў. Пры гэтым мае час і на рукадзелле, і на агарод, і на фітнес. Вось ужо 15 гадоў тры разы на тыдзень Надзея наведвае трэнажорную залу сваёй школы, дзе праходзяць заняткі з трэнерам. Любіць хадзіць пешшу і ездзіць на веласіпедзе.

— Я не ведаю, што такое дэпрэсія. Жыццё — гэта цудоўна, мы самі яго ствараем, — кінула мне рэпліку на развітанне Надзея Ластоўская, пераможца конкурсу «Жанчына года — 2023» з гарадскога пасёлка Воранава.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара і гераіні матэрыяла.**

# ГЭЙ, ВЫ, ТАМ, НАВЕРСЕ!..

## Шумныя суседзі не павінны перайсці ў ранг «уласнага дыягназу»

**Здавалася б, для суседзяў выдатна падышоў бы заклік з усім вядомага мультфільма пра ката Леапольда: «Дзеці, давайце жыць дружна!» Аднак жыццёвыя абставіны часам складваюцца так, што казаць пра сяброўства і добрыя адносіны не даводзіцца. Мы жывём з імі (суседзямі) на розных тэрыторыях, але ўсе разам ствараем гукі, якія па-рознаму ўспрымаюцца нашымі органамі пачуццяў.**

Гукі атачаюць нас з нараджэння. Да многіх з іх мы так прывыкаем, што нават не заўважаем: ціканне гадзінніка, вуркатанне ката, работа машыны за акном... Але ёсць і іншыя: шум п'янай кампаніі за сцяной, роў матацыкла на вуліцы, «лямант» перфаратара... Мы пачынаем раздражняцца. Што рабіць?

Першае — паспрабаваць пагаварыць і вырашыць пытанне з суседзямі мірна, бо лепш «перамагчы чужую армію не змагаючыся». Калі ж без барацьбы не абысціся, то можна скарыстацца пакрокавай інструкцыяй, заснаванай на жыццёвым вопыце і законах.

### КАЛІ ШУМ — ПАРУШЭННЕ ГУКАІЗАЛЯЦЫІ

У мяне свой вопыт барацьбы з шумамі. Але я быў тады з іншага боку «барыкад». У той час старэйшая дачка хадзіла ў музычную школу, а дома спрабавала іграць на піяніна. Ірала з 15 да 17 гадзін, не больш. Гучнасць інструмента мінімальная, але... У нас з'явіўся сусед, якому гэта «трынькание» не падабалася абсалютна. Ён працаваў у начную змену, а днём аддаваў перавагу адпачынку ў цішыні.

Мы спрабавалі дамовіцца і паменшылі час ігры да 1,5 гадзіны. Сусед спачатку пагадзіўся, але потым стаў патрабаваць не іграць на музычным інструменце ў суботу і нядзелю зусім. З гэтым пагадзіцца мы не маглі. З маніякальнай рэгулярнасцю сусед пачаў скардзіцца на нас у ЖЭС і міліцыю. Нас тады спрабавалі «выхоўваць» і тыя, і іншыя. У выніку быў суд, які дазволіў нам карыстацца музычным інструментам у «зберагальным рэжыме», што мы і рабілі раней.

**У старых і людзей з паталогіямі гучная музыка можа выклікаць гіпертанічны крыз. Уявіце, адны атрымліваюць асалоду, а іншыя — за сценкай — выклікаюць «хуткую».**

Як потым высветлілася, у павышанай гукапранікальнасці быў вінаваты... сам сусед. Ён зрабіў няякасную перапланіроўку сваёй кватэры: знёс дзве другарадныя сценкі, а на падлозе паклаў ламінат адразу на пліту перакрыцця, без залівання падлогі і падкладкі пад яе. Так што добра чутныя былі не толькі «трэлі», а нават нашы размовы.

Такая вось гісторыя. Але, як правіла, барацьба з шумамі працягваецца гадамі, а ў асобных выпадках — пакаленнямі.

### ЯКІЯ ГУКІ ВУШЫ «РЭЖУЦЬ»?

Адназначна непрыемнымі для чалавека з'яўляюцца гукі ад 80 дэцыбел. Такой сіле роўны крык чалавека. Отарыналарынголагі кажуць, што гукі мацнейшыя за 90 дБ, небяспечныя для слыху, а ўсё, што за мяжой 150 дБ, выклікае тугавухасць.

Дарэчы, невыпадкова існуе забарона на гучную музыку, рамонтныя работы пасля 23 гадзін. У нас ёсць рытмы сну і няспання. Падчас сну наш арганізм не проста адпачывае. Ён назапашвае гармон сну — мелатанін. Якраз да 23 гадзін яго ўзровень узрастае. І калі гэты час прапусціць, чалавек можа потым засынаць з вялікімі праблемамі.

Яшчэ горш на нас уздзейнічае музыка з празмернасцю высокіх і нізкіх частот (цяжкі рок), якія могуць выклікаць рэзананс у біялагічных тканках розных функцыянальных сістэм — сардэчна-сасудзістай, дыхальнай, мышачнай і нервовай.

Хуткія тэмпы, какафонія паскараюць сардэчны рытм і дыханне, павялічваюць артэрыяльны ціск, і, наадварот, павольныя тэмпы запавольваюць сардэчны рытм і паніжаюць артэрыяльны ціск. У старых і людзей з паталогіямі гучная музыка можа выклікаць гіпертанічны крыз. Уявіце, адны атрымліваюць асалоду, а іншыя — за сценкай — выклікаюць «хуткую».

Акрамя гукаў, якія мы добра чуем, ёсць інфрагукі і ўльтрагукі. Мы не ўспрымаем іх слыхам, не можам апісаць, але, тым не менш, адчуваем змены. Пачынаем адчуваць паніку, страх, неспакой.

Аднак мы не можам доўга знаходзіцца і ў абсалютнай цішыні. Нашы сенсорныя сістэмы павінны счытваць сігналы. Калі іх няма, мы пачынаем адчуваць наймацнейшы стрэс. Так што шум павінен быць, але, вядома, умераны. Нездарма існуюць пэўныя санітарныя нормы. Гэтыя нормы паказваюць, да чаго чалавек можа адаптавацца.



### ВЕДАЦЬ СВАЕ ПРАВЫ

Перш чым ісці вайной на суседзяў, варта вывучыць «Правілы карыстання жылымі памяшканнямі», дзе замацавана норма пра тое, што карыстацца тэлевізарамі, радыёпрыёмнікамі, магнітафонамі і іншымі гучнагаварыцелямі можна толькі пры ўмове памяншэння чутнасці да ступені, якая не парушае спакою іншых грамадзян у жылым доме. У любы дзень тыдня з 23 да 7 гадзін не павінны адбывацца дзеянні, якія ствараюць вібрацыю і шум.

Дапушчальныя і максімальныя ўзроўні гуку ў жылых памяшканнях жылога дома павінны адпавядаць санітарным нормам. Пры гэтым дапушчальным узроўнем шуму з'яўляецца такі ўзровень, які не выклікае ў чалавека значнай турботы і істотных змен паказчыкаў функцыянальнага стану сістэм арганізма, адчувальных да шуму.

Калі вы лічыце, што ўзровень шуму нават у дазволены час перавышае дапушчальнае значэнне, то яго трэба вымераць. Самастойна гэта зрабіць не атрымаецца, нават калі спампаваць на мабільны тэлефон спецыяльныя дадаткі. Даследаванні ўзроўню шуму на дагаворнай аснове ажыццяўляюць органы і ўстановы Дзяржсаннагляду і іншыя юрыдычныя і фізічныя асобы, акрэдытаваныя на правядзенне названых даследаванняў. Калі наспела вострая сітуацыя, жыхары могуць звярнуцца ў санстанцыю, каб зрабіць неабходныя замеры.

У сваю чаргу, эксплуатацыйныя арганізацыі абавязаны перыядычна правяраць санітарна-тэхнічны стан канструкцый і элементаў жылых дамоў і своечасова ўстараняць выяўленыя няспраўнасці, у тым ліку і рэагаваць на вырашэнне праблем залішняга шуму.

Акрамя правілаў, варта ведаць і нормы, якія рэгулююць час, калі не дазваляюцца работы па перабудове і перапланіроўцы, але не рамонтныя работы ў кватэры. Да работ па перабудове і (або) перапланіроўцы адносяцца:

— змена або перанос сістэм газазабеспячэння, цэнтральнага ацяплення, смеццевыдалення, газавыдалення;

— змена ў апорных канструкцыях;

— змена плошчы, колькасці жылых пакояў і падсобных памяшканняў у кватэры за кошт разборкі існуючых і (або) уладкавання новых перагародак;

— уладкаванне, павелічэнне праёмаў у ненясучых сценах і перагародках.

Менавіта для такіх шумных работ дзейнічае больш жорсткі графік: нельга праводзіць адпаведныя дзеянні ў выхадныя і святочныя дні, а ў працоўныя дні нельга пачынаць іх раней за 9 гадзін і заканчваць пазней за 19 гадзін.

### АСАЦЫЯЛЬНЫЯ ЖЫХАРЫ І ШТРАФЫ

Шумець у жылых дамах (як мы ўжо гаварылі) забаронена з 11 вечара да 7 раніцы. На гэты час дзейнічае забарона нават на гучныя размовы і пляскание дзвярыма. А ўключаць на поўную магутнасць музыку, тэлевізар, гульнявую прыстаўку і іншае ў шматпавярховых дамах забаронена і ў любы іншы час.

Калі вам перашкаджае шум з суседняй кватэры і на просьбы паводзіць сябе цішэй суседзі не рэагуюць, трэба выклікаць міліцыю. Адказнасць за шум прадугледжана адпаведным артыкулам Кодэкса нашай краіны аб адміністрацыйных правапарушэннях.

Калі факт парушэння даказваюць, то максімальнае пакаранне — штраф 10 базавых велічынь (цяпер — 400 рублёў). У цэлым штрафы няйдрэнна адвучаюць суседзяў шумець, але каб чалавека аштрафавалі, трэба даказаць, што шум быў. Калі суседзі да прыезду міліцыі не сціхлі, то доказам будзе рапарт, які складуць праваахоўнікі, і ваша заява.

Складаней дамагчыся справядлівасці і цішыні ў сітуацыі, калі вы маеце справу з тымі, хто вядзе асацыяльны лад жыцця і ўжо неаднаразова прыцягваўся да адміністрацыйнай ці нават крымінальнай адказнасці. Такі кантынгент да прыезду міліцыі часта шумець перастае, а як толькі праваахоўнікі з'язджаюць, гучныя гукі вяртаюцца.

Міліцыянеры званяць у кватэру, на шум з якой вы жаліцеся, і калі дзверы адчыняюць, то гутараць з жыхарамі, а вам прапануюць напісаць заяву. Калі шум сапраўды гучны, перашкаджае адпачываць і выпадак з гэтымі суседзямі не адзінкавы, то заяву варта скласці.

Пры гэтым у ёй можна пералічыць і жыхароў іншых кватэр, якім таксама мог перашкодзіць шум. Міліцыя іх апытае, і калі яны пацвердзяць скаргу — вінаватых чакае штраф.

Калі на прыезд міліцыі адгукнуліся не толькі вы, але і хтосьці яшчэ з суседзяў, то праблема з доказваннем вырашана — дзве заявы, як правіла, з'яўляюцца дастатковым пацвярджэннем таго, што парушэнне было.

### КАЛІ ПОБАЧ УЗНІК «ПРЫТОН»

Перыядычны шум, непрыемны пах, шматлікія «дробныя сюрпрызы» ў пад'ездзе — гэта тое, з чым пастаянна сутыкаюцца суседзі тых людзей, якія моцна п'юць. Звычайна штрафы ў падобных выпадках бессэнсоўныя, таму што гэты «кантынгент» рэдка працуе. Для такіх выпадкаў, праўда, дзейнічаюць лячэбна-працоўныя прафілакторыі. Аднак працэдура накіравання ў ЛПП досыць працаёмкая, нават нягледзячы на тое, што ў ёй дапамагаюць праваахоўныя органы. Накіраваць у такую ўстанову суседа можна, калі ён тры разы за год прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за правіны, пры здзяйсненні якіх знаходзіўся ў стане ап'янення (лічыцца і наркатычнае, і алкагольнае, і таксічнае).

Пасля гэтага супрацоўнікі міліцыі павінны афіцыйна папярэдзіць «моцна хворага» чалавека аб магчымасці накіравання ў прафілакторый. Само накіраванне ў ЛПП магчыма пасля здзяйснення яшчэ аднаго адміністрацыйнага правапарушэння ў стане ап'янення на працягу года пасля папярэджання.

Але... Калі па выніках медыцынскага агляду не пацвердзілася хранічная залежнасць або выяўлена супрацьпаказанне для накіравання (ёсць такі пералік захворванняў), то ў ЛПП накіраваць не могуць. Не накіроўваюць у прафілакторый таксама непаўналетніх, пенсіянераў, цяжарных жанчын і жанчын, якія выхоўваюць дзяцей да года, а таксама інвалідаў І і ІІ групы.

### КРАЙНІ ВЫПАДАК

У выпадку пастаяннага парушэння вашымі суседзямі Правілаў карыстання жылымі памяшканнямі яны могуць быць выселены ў судовым парадку без прадастаўлення іншага жылога памяшкання.

Гэты жорсткі вердыкт выкарыстоўваюць у дачыненні да тых людзей, якія на працягу года тры і больш разоў прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнні Правілаў карыстання жылымі памяшканнямі, утрымання жылых і дапаможных памяшканняў, якія выявіліся ў разбурэнні, псаванні жылога памяшкання або ў выкарыстанні яго не па прызначэнні ці за іншыя парушэнні патрабаванняў гэтага Кодэкса, якія робяць немагчымым для іншых пражыванне з такімі суб'ектамі ў адной кватэры або ў адным жылым доме. Раней яны былі папярэджаны ўласнікам аб магчымасці высялення без прадастаўлення іншага жылога памяшкання і на працягу года пасля такога папярэджання прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці за аналагічныя правапарушэнні.

І яшчэ. Калі ваш спакой парушаны суседскім сямейным скандалам, лаянкай, прыкметамі гвалту, пагрозай жыццю, заклікамі на дапамогу, варта неадкладна тэлефанаваць у «102», каб супрацоўнікі міліцыі паспелі спыніць правапарушэнне і не дапусціць трагедыі.

Сяргей КУРКАЧ.

# ПРЫГОДЫ 110-ГАДОВАЙ ПАШТОЎКІ,

## альбо Куды вядзе бульвар Татлебена

**Ці ведаеце вы, сябры, колькі можа распавесці аб продках адна толькі старадаўняя паштоўка, калі вывучаць яе дасканала? Яна дазволіць зрабіць сапраўдны прарыў у генеалагічным расследаванні. І я збіраюся пераканаць вас у гэтым на асабістым прыкладзе.**

**А яшчэ мы даведаемся пра тое, чаму дамавыя кнігі — больш чым падарунак лёсу; чым карысныя гарадскія даведнікі і якія сенсацыйныя звесткі пра родных можна адшукаць, «гартаючы» анлайн-перыёдыку даўніх часоў.**

### МАТЫЛЁК, ФІЯЛКІ І ВЭЛЮМ

Гэтая рарытэтная паштоўка — быццам незвычайны матылёк у маёй сямейнай калекцыі. Дрыжыш за тое, каб пылок на яго пафарбаваных крылцах выпадкова не пашкодзіць.

Малахітавага колеру стужка, на ёй медальён у форме сэрцайка, унутры вяночак з фіялетавых кветак, падобных на фіялкі, а ў сярэдзінцы сэрца квітнее вясна ў пейзажнай мініяцюры: рэчка, поплаў, сцяжынка, аблокі. Усё такое пяшчотнае, у светлым вэлюме блакітна-зялёных адценняў... Віншавальную паштоўку, падабраную з гэткім густам, да таго ж каляровую, што ў тыя часы сустракалася даволі рэдка, адаслаў мой 29-гадовы дзядуля Ёнас маёй 21-гадовай бабулі Людзьвіке ў дзень яе нараджэння. І было гэта роўна 110 гадоў таму! *(фота № 1)*



Фота 1. Паштоўка, якой споўнілася 110 гадоў (з калекцыі Алы Жур).

Аднолькавыя даты на штампах адрасата і адрасанта 14.04.1914 і месца Рыга сведчаць аб тым, што ў гэты перыяд жыцця Ёнас і Людзьвіка знаходзіліся ў сталіцы Ліфляндыі. І яшчэ не пабраліся шлюбам, бо на паштоўцы, як бачым, у іх розныя прозвішчы. Аднак па сямейных звестках вядома, што неўзабаве яны пажэняцца ў Рызе, куды ў пачатку 1900-х паедуць на заробкі.

Тэкст у паштоўцы напісаны на роднай літоўскай мове, але толькі літарамі з кірыліцы (як таго патрабавалі правілы пошты для замежных грамадзян на тэрыторыі Расійскай імперыі «для забеспячэння правільнай дастаўкі»).

Пераклад віншавання выдае далікатнасць адносін маладога чалавека да дзяўчыны і сур'ёзнасць яго намераў: «Маю гонар павіншаваць спадарыню з імянінамі з пажаданнем шмат шчасця. З шчырай павагай, І. Пятрыла».

Знайсці дакладны адрас у паштоўцы з хатняга архіва — заўсёды ўдача для даследчыка, і ў дадзеным выпадку радок «бульвар Татлебена, дом 10, кв. 3» дае мне шанц праліць святло на «рыжскі след» у радаводзе майго бацькі, а магчыма, і развянчаць сямейныя легенды.

Па звестках родных, бабуля Людзьвіка працавала ў Рызе прыслугай у заможных гаспадароў. Рэкамендацыю ёй даў граф Нарышкін, які ў Літве валодаў маёнткам Груздзі (Грузджай) Шавельскага (Шаўляйскага) павету, адкуль Людзьвіка родам. Але кім быў яе гаспадар, каму належаў дом № 10 па бульвары Татлебена?.. Я пачала шукаць у інтэрнэце хоць якую зачэпку. І раптам бульвар «прывёў» мяне на форум «Размовы пра Рыгу» (forum.myriga.info), дзе сабраліся апантаныя і ўлюбёныя ў гісторыю Рыгі знаўцы. І дзякуючы ўсім гэтым экспертам і мазгавым штурмам нечакана ў нас атрымалася захапляльнае грунтоўнае даследаванне ў духу мінулага стагоддзя. З дэдуктыўнымі метадамі Шэрлака Холмса, які, дарэчы, мае таксама рэальнае дачыненне да гэтай гісторыі.



Фота 3. Бульвар Татлебена ў Рызе, канец XIX стагоддзя (крыніца forum.myriga.info).

### АКНО З ДЗЯВОЧАГА ПАКОЯ

Дык вось, у кватэры № 3 па бульвары Татлебена, 10 (па звестках штогадовага адраснага календара за 1907 год «Rigasches Adress-Buch») — і я ніколі не здолела б прачытаць яго без дапамогі знаўцаў з форуму, бо змест быў напісаны не толькі па-нямецку, але і гатычным шрыфтам — пражываў сын купца Рыжскай І Гільдыі Абрам Нахімаў Рабіновіч. І дзяўчынка Людзьвіка працавала прыслугай у яго сям'і, дарэчы, даволі вядомай у Рызе. Абрам Рабіновіч быў паважаным грамадскім дзеячам, старшынёй праўлення Паўночнага банка. А паходзіў яны з Віцебскай губерні.

Пяціпавярховы даходны дом № 10, у якім жыла сям'я купца, належаў нашчадкам Johann Kneet, будаўнічага прадпрымальніка, і быў пабудаваны ў стылі эклектыкі ў 1884 годзе. Яго філіграннае аздабленне фасада — візітная картка вядомага архітэктара Карла Іагана Фельско. Гэты дом, як і большасць будынкаў на бульвары Татлебена, сёння помнік архітэктуры *(фота № 2)*.

Цікава, а што бачыла дзяўчына Людзьвіка, выглядваючы з акна кватэры № 3? Недалёка знаходзілася Эспланада — пыльнае поле для вайсковых практыкаванняў. І, хутчэй за ўсё, з ветрам адтуль у вокны дома прылятала шмат пылу: шкло, вядома, даводзілася мыць часта. Насупраць, у доме № 13, каля ўвахода ў прэстыжнае Рыжскае камерцыйнае вучылішча, тоўпіліся яго выхаванцы. Пад самымі вокнамі грукалі па брусчатцы вазкі.

Кватэра № 3 знаходзілася на другім паверсе, з левага боку, у гэтым корпусе размяшчалася па дзве кватэры на кожным паверсе. Калі выдавалася вольная хвілінка, Людзьвіка, магчыма, перакідвалася слоўцам са служанкай з суседняй, 4-й кватэры. Быт служанкі ў тыя часы быў сціплы. Яна «мітусілася» ў асноўным на кухні, а спала ў цесным дзявочым пакоі, сумежным з кухняй, і такія памяшканні заўсёды выходзілі вокнамі ў двор.

Важкім суседствам для жыхароў гэтага дома было Рыжскае аб'яднанае пачатковае вучылішча ў доме № 8. На перапынках там добра чуліся заліўістыя галасы дзятвы. І акно дзявочага пакоя Людзьвікі якраз выходзіла на школьны двор.

Між тым сам бульвар Татлебена за ўсю гісторыю свайго існавання перайменоўваўся ажно 11 разоў! У 1860 г. за былымі крапаснымі валамі стварылі вуліцу, якая пралягала ўдоўж армейскага пляца (эспланады), і назвалі Эспланадная. У 1868 г. яна згадваецца ўжо як Эспланадны бульвар. У 1885 годзе перайменавана ў бульвар Эдуарда Татлебена, у гонар генерала Расійскай арміі, родам з Елгавы. У 1919 г.



Фота 2. Дом № 10, бульвар Калпака: так выглядае цяпер (былы Татлебена).

гэта Люксембургскі праспект у памяць забітай нямецкай камуністкі. З 1923 г. — ужо бульвар Оскарса Калпака, у гонар латышскага палкоўніка. У 1941 — перайменаваны ў бульвар Камунараў, у час нямецкай акупацыі — Bismarcking (алея Бісмарка), а ў 1942 — зноў Kalpakstrasse (вуліца Калпака). У савецкі час вяртаюць назву — бульвар Камунараў. У пачатку 1950-х згадваецца ўжо як праспект Сталіна. У 1991-м аднаўлена назва бульвар Калпака *(фота № 3, forum. myriga.info)*.

Па гэтым бульвары ў адкрытым экіпажы 4 ліпеня 1910 года праязджаў Мікалай ІІ, а ў 1920–30-я гады тут знаходзілася Пасольства СССР. Па адрасе Татлебена, дом № 7, кв. 3 выдаваўся ілюстраваны беларуска-грамадскі часопіс «На Чужыне», першы нумар якога выйшаў 3 сакавіка 1920 года. У маляўнічым наваколлі Латвійскай акадэміі мастацтва шпацыраваў Шэрлак Холмс, пра якога там здымаўся ўсім вядомы фільм.

А з варотаў дома № 10 выходзіла і паспешлівай хадой накіроўвалася да касцёла Тужлівай Багамаці Людзьвіка, мая бабуля.

Я бачу за радкамі паштоўкі ўсё гэта аб'ёмна, быццам у фармаце 3D: і дом, і акенцы, і дах, і неба з узнятым лісцем і птушкамі. І нявесту, прыемна засмучаную, якая чытае віншаванне, што прынёс паштальён.

### АБРАБАВАННЕ НА ВУЛІЦЫ ГЕРТРУДЭС

А дзе ж жыў сам яе суджаны, адаслаўшы паштоўку з сэрцайкам і фіялкамі? Пашанцавала мне з дапамогай знаўцаў-фарумчан атрымаць і гэтыя сенсацыйныя вынаходкі.

Калі Ёнас Пятрыла быў гадзіннікавым майстрам (ура, гэта так і ёсць!), то, магчыма, у 1907 годзе менавіта ён пражываў пад імем Івана Пятрылы на Малой Палісаднай (цяпер Калупес) вуліцы, дом 8, у 34 кватэры, як сведчыць запіс у Рыжскай адрасны кнізе.

А далей знаходзім надзвычай цікавую заметку ў рыжскай газеце «Dzimtenes Vestens», № 117, за 1 мая 1915 г. (анлайн-часопісы XIX і XX стагоддзя: www-periodika):

«Па вуліцы Гертрудэс,110 мінулай ноччу была ўзламаная крама гадзіннікаў Пятрылы, былі скрадзены гадзіннікі і пярсцёнкі на суму 80 рублёў».

У маіх пошуках робіцца не проста цёпла, а горача!

Месца рабавання гадзіннікавай крамы спадара Пятрылы знаходзіцца на адлегласці менш чым 200 метраў ад месца жыхарства гадзіннікавага майстра Івана Пятрылы па вуліцы М. Палісадная (ад дома да работы толькі чыгуначныя пуці перайсці!). Ці можа гэта быць простым супадзеннем? Думаецца, што не.

А ці знайшлі злачынцаў? Малаверагодна. У рыжскай перыёдыцы тых часоў мне трапілася шмат паведамленняў пра выпадкі рабавання гадзіннікавых і ювелірных крам, болей жудасных, часам нават з забойствам гаспадароў. Аднак стрымаць крымінальную хвалю здолелі толькі ў другой палове года, калі ў Рызе ў сувязі з набліжэннем фронту наступіў стан аблогі і справы пачалі разглядаць вайсковыя суды.

З аднаго боку, толькі «дзякуючы» абрабаванню крамы з выпадкова знойдзенай заметкі ў анлайн-перыёдыцы я даведалася пра найцікавейшыя падрабязнасці біяграфіі родных, а з іншага, па шчырасці, мне вельмі шкада, што ў 1915 годзе пацярпеў мой дзядуля.

Але ўсё гэта пры ўмове, што Іван Пятрыла сапраўды мой дзядуля Ёнас, і каб пераканацца ў тым на сто працэнтаў, неабходна зазірнуць у больш грунтоўныя крыніцы.

### ЧЫТАЙЦЕ ДАМАВЫЯ І АДРАСНЫЯ КНІГІ

Адрасныя гарадскія кнігі карысныя, каб нешта праверыць наўскідку. У іх у першую чаргу траплялі ўладальнікі нерухомасці і тыя, хто пажадаў размясціць свае даныя. Там не знойдзеш інфармацыі аб усім насельніцтве. Дазнацца, калі і адкуль чалавек прыехаў-з'ехаў, дапамогуць дамавыя кнігі: у іх праводзілася абавязковая рэгістрацыя кожнага чалавека па месцы фактычнага жыхарства. Акрамя таго, там пазначаўся саслоўны статус і прыпіска да месца, якія ў Расійскай імперыі меў кожны. Адным словам, у дамавых кнігах вы знойдзіце шмат каштоўнай інфармацыі аб продках. Галоўнае — каб тыя кнігі захаваліся.

І ў дадзеным выпадку мне пашанцавала тройчы! Дамавыя кнігі па патрэбных адрасах у рыжскім архіве захаваліся, а галоўнае — запісы ў іх пацвердзілі: прыбыўшы 27 чэрвеня 1906 года на М. Палісадную № 8, у кв. 34 Іван Антонаў Пятрыла, гадзіннікавы майстар, і ёсць мой родны дзядуля. А ў дамавой кнізе па бульвары Татлебена № 10, у кватэры № 3, знайшоўся запіс і пра бабулю — Ваўпшас Людзьвіку Алаізіеву, служанку, 17 гадоў (на момант упіскі 12 верасня 1911 г.), якая выбыла 18 ліпеня 1915 года.

Як дзіўна даведацца праз 109 гадоў аб прычыне, якая крута змяніла жыццё маіх блізкіх, звязаўшы гэтыя два знойдзеныя факты: 1 мая 1915 года абрабавана гадзіннікавая крама Пятрылы, а 18 ліпеня 1915 года Людзьвіка Ваўпшас выпісваецца з кватэры. І назаўсёды разам з мужам пакідае Рыгу, падалей ад франтавога горада, захаваўшы ў сваім чорным аксамітавым рыдыкюлі запаведную паштоўку, без якой я ніколі не даведалася б пра ўсю гэту гісторыю.

Таму шчыра раю і вам, сябры: шукайце паштоўкі і лісты! Раптам недзе і ў вас на антрэсолях чакае свайго зоркавага часу такая чароўная паштоўка?..

Паштоўкі, лісты, нават кароткія заметкі — важныя генеалагічныя і біяграфічныя крыніцы для вывучэння гісторыі сям'і. Вы зможаце высветліць: імёны, важныя даты, месцы жыхарства, працы. Чытаючы лісты, звяртайце ўвагу на кожны дробны факт!

**Ала ЖУР.**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(Организатор аукциона)**
**извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Несвижский райагросервис» (Продавец)**

Аукцион состоится **02.07.2024 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1:** Трактор МТЗ-80,
заводской номер 705504, г. в. 1990.
Начальная цена с НДС 20 % – 9 120,00 руб.
Задаток – 2 000,00 руб.

**Лот № 2:** Трактор «Беларус-892»,
заводской номер 90816287, г. в. – 2011.
Начальная цена с НДС 20 % – 18 480,00 руб.
Задаток – 2 000,00 руб.

**Лот № 3:** Трактор «Беларус-82»,
заводской номер 741, г. в. – 2012.
Начальная цена с НДС 20 % – 21 840,00 руб.
Задаток – 2 000,00 руб.

**Лот № 4:** Комбайн кормоуборочный JOHN DEERE 7480 с жаткой и подборщиком,
заводской № 1Z07480YADF513216, г. в. – 2013.
Начальная цена с НДС 20 % – 255 600,00 руб.
Задаток – 50 000,00 руб.

Место нахождение Лотов №№ 1, 2, 3, 4: Минская обл., Несвижский район, д. Рудавка, ул. Ленинская, 162.
Шаг аукциона – 5 %.
Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений и задатка – 28.06.2024 в 11.00.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

**ОДО «Агромашзапчасть»** (УНП 700223739) уведомляет о реорганизации в форме присоединения к нему **ОДО «АВТО-1000»** (УНП 790619564).
ОДО «Агромашзапчасть» в соответствии с передаточным актом является полным правопреемником всех прав и обязанностей ОДО «АВТО-1000»

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «МГЦН» 18 **июня** 2024 **года** проводит 376-**й открытый аукцион по продаже права заключения договоров аренды** капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности (далее – имущество)

| № предмета аукциона | Арендодатель имущества | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента спроса к базовой ставке арендной платы (от 0,3 до 3) или размер арендной платы в БАВ | Начальная цена права заключения договора аренды имущества/ сумма задатка (руб.) | Наименование и целевое использование имущества |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 87 | УП «Жильё», тел. 8 (0177) 768532 | Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, пр. Революции, 11 | 10,80 | 3,0 | 47,95 | Одноэтажное кирпичное здание: 1) для организации торговли непродовольственной и (или) продовольственной группами товаров; 2) под оказание услуг (кроме ритуальных услуг и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр, а также физкультурно-оздоровительной деятельности). **Срок аренды 3 года** |
| 88 | | Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Чаловской, 18-12 | 30,90 | 3,0 | 137,20 | Помещение: 1) для организации торговли непродовольственной и (или) продовольственной группами товаров; 2) под оказание услуг (за исключением ритуальных услуг и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр и физкультурно-оздоровительной деятельности); 3) под офис; 4) под склад. **Срок аренды 3 года** |
| 89 | | Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 8 Марта, 25-90 | 37,10 | 1,0 | 164,72 | Часть изолированного нежилого помещения: 1) под офис; 2) для организации торговли непродовольственной группой товаров; 3) под предоставление услуг (кроме ритуальных услуг и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр и физкультурно-оздоровительной деятельности); 4) под склад. **Срок аренды 3 года** |
| 90 | | Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Максима Горького, 102 | 49,88 | 1,0 | 221,47 | Помещение: 1) для организации торговли непродовольственной и продовольственной группами товаров; 2) под оказание услуг (кроме ритуальных услуг (ритуальных магазинов) и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр и физкультурно-оздоровительной деятельности; 3) под офис; 4) под склад. **Срок аренды 3 года** |
| 91 | | Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Нормандия-Нёман, 149 | 70,00 | 3,0 | 310,80 | Помещения: 1) для организации торговли непродовольственной группой товаров; 2) под оказание услуг (кроме ритуальных услуг (ритуальных магазинов) и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр, физкультурно-оздоровительной деятельности); 3) под офис; 4) под склад. **Срок аренды 3 года** |
| 92 | | Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Орджоникидзе, 57 | 9,75 | 1,0 | 43,29 | Помещение: 1) под офис; 2) под склад; 3) для организации торговли непродовольственной группой товаров; 4) под оказание услуг (кроме ритуальных услуг (ритуальных магазинов) и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр и физкультурно-оздоровительной деятельности). **Срок аренды 3 года** |

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. +375 (17) 360 42 22. Аукцион состоится **18 июня 2024 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 28 мая 2024 г. по 12 июня 2024 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Расчетный счет для перечисления задатка: BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа – 40901, назначение платежа – **задаток для участия в аукционе № 376 от 18.06.2024 по предмету аукциона № ___**.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах изложен в извещении о проведении аукциона, размещенном на интернет-сайтах: организатора аукциона – **www.mgcn.by** (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»), Минского областного исполнительного комитета – **www.minsk-region.gov.by** (раздел «Аукционы по продаже недвижимости»).
**Телефон для справок +375 (17) 360 42 22**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ

## Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП» 13 июня 2024 в 14.00 проводит повторные торги по продаже следующих объектов

**ЛОТ № 1: КОМПЛЕКС ИМУЩЕСТВА (АВТОТРАКТОРНЫЙ ЦЕХ) В СОСТАВЕ:**

| № п/п | Наименование основных средств | Инв. № | Дата ввода в эксплуатацию | Основные технические и эксплуатационные характеристики |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Автотракторный цех, пристройка – административный, пристройка – бытовка, пристройка – аккумуляторная, в том числе: | | | Площадь 1114 м², кирпичное, объем здания 4504 м³, крыша совмещенная рулонная, шиферная |
| | Здание автотракторного цеха с пристройкой-бытовкой, пристройкой-аккумуляторной | 00110053 | Декабрь 1948 | |
| | Здание административное, инв. № кап. стр. 730/С-279, г. Кричев | 00110179 | Декабрь 2007 | |
| 2. | Здание боксов для хранения техники с топочным отделением | 00110256 | Декабрь 2010 | Площадь 407,1 м², кирпичное, объем здания 2800 м³, крыша – металлопрофиль, в топочной – шиферная |
| 3. | Металлический навес для стоянки автомобилей, инв. № кап. стр. 730/С-346 | 00110125 | Декабрь 1979 | Навес стойки металл, крыша шиферная, площадь 535,05 м², объем 1822 м³ |
| 4. | Навес для дров | 00110257 | Декабрь 2010 | Навес, стены – ж/б плиты, сетка, крыша шиферная, площадь 47,1 м², объем высота 2,8 м |
| 5. | Навес для стоянки автомобиля, инв. № кап. стр. 730/С-13600 | 00110233 | Июль 2009 | Навес, стены – шифер, крыша шиферная, площадь 84,14 м², объем 449 м³ |
| 6. | Охранный пункт | 00110112 | Август 2004 | Кирпичное здание пункта охраны, 2 этажа |
| 7. | Ограждение к автотракторному цеху, инв. № кап. стр. 730/С-13299 | 00220084 | Август 2004 | |
| 8. | Площадка бетонная, инв. № кап. стр. 730/С-13222, г. Кричев ул. Зеленая, 4 | 00220131 | Декабрь 2007 | Бетонная площадка 15,2х21,1 м |
| 9. | Трансформаторная подстанция | 00110132 | Декабрь 1962 | Трансформаторная подстанция |
| 10. | Насаждения ограниченного пользования | 00970253 | Июль 2010 | Деревья, кустарники |
| 11. | Котёл стальной твердотопливный | 00540159 | Август 2009 | Отопительный котёл |
| 12. | Котёл стальной твердотопливный | 00540158 | Август 2009 | Отопительный котёл |
| 13. | Трансформатор ТМГ11-1250/10У1 | 00540165 | Октябрь 2009 | Силовое электрооборудование |
| 14. | Трансформатор ТМГ11-1250/10У1 | 00330231 | Октябрь 2009 | Силовое электрооборудование |
| 15. | Кабельные линии электропередач ЦРП-2 до ТП-7 (сырьевой) | 00540165 | Август 2011 | Линии электропередач |
| 16. | Подстанция ТП-7 | 00540018 | Декабрь 1963 | Силовое электрооборудование |
| 17. | Электроводонагреватель ЭВА-450/15 | 00445319 | Ноябрь 2011 | Нагреватель воды |

**Начальная цена продажи лота № 1 снижена на 80 % и составляет с учетом НДС (20 %): 46 370,40 (сорок шесть тысяч триста семьдесят белорусских рублей 40 копеек), задаток 4 637,04 (четыре тысячи шестьсот тридцать семь белорусских рублей 04 копейки).**

**ЛОТ № 2: КОМПЛЕКС ИМУЩЕСТВА (ЦЕХ КИПиА) В СОСТАВЕ:**

| № п/п | Наименование основных средств | Инв. № | Дата ввода в эксплуатацию | Основные технические и эксплуатационные характеристики |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Здание КИПиА, инв. № кап. стр. 730/С-343, г. Кричев | 00110063 | Декабрь 1965 | Площадь 1006,43 м², кирпичное, объем здания 4242 м³, крыша рулонная, водопровод, центральное отопление |
| 2. | Бассейн декоративный | 00220196 | Декабрь 2007 | Бетонный оштукатуренный бассейн с распылителем, 1 м³ |
| 3. | Насаждения ограниченного пользования | 00970252 | Июль 2010 | Деревья, кустарники |

**Начальная цена продажи лота № 2 снижена на 80 % и составляет с учетом НДС (20 %): 23 856,00 (двадцать три тысячи восемьсот пятьдесят шесть белорусских рублей 00 копеек), задаток 2 385,60 (две тысячи триста восемьдесят пять белорусских рублей 60 копеек).**

**ЛОТ № 3: КОМПЛЕКС ИМУЩЕСТВА (ЗДАВПУНКТ) В СОСТАВЕ:**

| № п/п | Наименование основных средств | Инв. № | Дата ввода в эксплуатацию | Основные технические и эксплуатационные характеристики |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Здание здравпункта (цех здоровья), инв. № кап. стр. 730/С-183, г. Кричев | 00110082 | Декабрь 1979 | Площадь 258,76 м², кирпичное, объем здания 1183 м³, крыша рулонная, водопровод, центральное отопление |
| 2. | Насаждения ограниченного пользования | 00970254 | Июль 2010 | Деревья, кустарники |

**Начальная цена продажи лота № 3 снижена на 80 % и составляет с учетом НДС (20 %): 4 872,00 (четыре тысячи восемьсот семьдесят два белорусских рубля 00 копеек), задаток 487,20 (четыреста восемьдесят семь белорусских рублей 20 копеек).**

**ЛОТ № 4: КОМПЛЕКС ИМУЩЕСТВА (ИСПЫТАТЕЛЬНЫЙ ЦЕНТР) В СОСТАВЕ:**

| № п/п | Наименование основных средств | Инв. № | Дата ввода в эксплуатацию | Основные технические и эксплуатационные характеристики |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Здание лаборатории испытательного цеха, инв. № кап. стр. 730/С-288, г. Кричев | 00110064 | Декабрь 1960 | Площадь 483,75 м², кирпичное, объем здания 2254 м³, крыша совм. рулонная, водопровод, центральное отопление |
| 2. | Склад кислоты, инв. № кап. стр. 730/С-438, г. Кричев, ул. Зеленая | 00110130 | Декабрь 2004 | Площадь 10,59 м², кирпичное, объем 43 м³, крыша шиферная, окна |

**Начальная цена продажи лота № 4 снижена на 80 % и составляет с учетом НДС (20 %): 6 816,00 (шесть тысяч восемьсот шестнадцать белорусских рублей 00 копеек), задаток 681,60 (шестьсот восемьдесят один белорусский рубль 60 копеек).**

**Собственник имущества:** открытое акционерное общество «Кричевцементношифер», 213493, Республика Беларусь, Могилевская область, Кричевский р-н, Краснобудский с/с, 2, АБК в районе месторождения «Каменка», тел. +375224120909, тел. для осмотра объектов продажи +375224120914.

**Организатор торгов:** унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1. www.mogilev.cci.by

**Место проведения торгов:** г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лоты №№ 1–4 продаются без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Задаток перечисляется на расчетный счет: унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП» р/с № BY88ALFA30122641790010270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Могилев, BIC: ALFABY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

**Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет-сайте продавца по адресу: www.mogilev.cci.by.**

**Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем)** – в течение 10 календарных дней после проведения торгов.

Срок оплаты за предметы торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

**Торги состоятся 13 июня 2024 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».**

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112. Последний срок подачи заявления – 12 июня 2024 г. до 12.00.

Регистрация участников торгов: 13 июня 2024 г. с 13.30 до 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».
Телефоны для справок:
(0222) 778032, + 375447350030 (А1) –
Жилина Ольга Александровна.
Дополнительная информация размещена на сайте организатора.

Извещение о предыдущих торгах по объектам было размещено в газете «Звязда» от 25.07.2023, 20.09.2023, 10.10.2023, 07.12.2023, 12.01.2024, 13.02.2024.

Запрашальнік

# УБАЧЫЦЬ НЯСВІЖ І... ПАЛЮБІЦЬ ОПЕРУ

## Паездка ў Нясвіж — гэта добрая нагода дакрануцца да культуры, гісторыі і цудоўна адпачыць

**КОЖНЫ дасведчаны турыст, мусіць, успомніць, як падчас паўнай вандроўкі сустракаўся некалькі разоў за дзень з аднымі і тымі ж людзьмі каля розных знакавых месцаў. Вось і цяпер, збіраючыся на «Вечары Вялікага ў замку Радзівілаў», згадала, як летась у адзін з такіх фестывальных дзён мае шляхі часта перасякаліся з сям'ёй мінчан.**

Свой аўтамабіль яны пакінулі на паркоўцы і амаль адразу звярнулі ўвагу на шэрагі гандляроў сувенірамі. Першы вокліч хлопчыка гадоў дванаццаці быў такі: «О, як за мяжой!» Потым мы ўбачыліся ў сувенірнай краме палаца. Хлопчык выказваў сваё захапленне рыцарскай залай, а яго сястра, як мне падалося, гадоў сямі, разважала, як бы яна тут жыла, калі б была сапраўднай прынцэсай.

Пасля абеду мы сустрэліся зноў. Сям'я была ў захапленні ад фатаграфій у стылізаваных касцюмах, якія тут жа друкуюцца на магнічіках. Усё гэта я пачула, калі мы аказаліся на велапаркоўцы. Я дакладна ведала, што вазьму напракат веламабіль — гэта мая любімая забава. Дзяцей жа не ўразілі веласіпеды і паравозік з электробусам, і я парэкамендавала ім адправіцца на водную прагулку на лаўдзі. Там і вёсламі можна было «паруліць».

Бліжэй да пачатку спектакля сямейства зноў аказалася побач. Жанчына прапанавала сваім: «А давайце купім білеты і сходзім на спектакль». Яе муж адказаў, што не любіць оперу. Тут я, каюся, зноў умяшалася: «Так усе гавораць, пакуль не паслухаюць». І яны купілі квіткі!

Калі мы апынуліся амаль што побач і ў глядзельный зале, я ўжо не здзівілася, як і тому, што той, хто не любіў оперу, гучней за ўсіх апладзіраваў артыстам Вялікага тэатра.

Навошта гэтыя мае ўспаміны? Ды ўсё проста! **З 14 да 16 чэрвеня** ў Нясвіжы пройдуць чарговыя «Вечары Вялікага ў замку Радзівілаў». Як заўсёды, у праграме цудоўны канцэрт у сценах найпрыгажэйшага касцёла Божага цела. (Традыцыйна на гэту імпрэзу не трэба купляць квіткі.)

Аматары балета ўбачаць у Нясвіжы «Жызэль» у пастаноўцы галоўнага балетмайстара тэатра Ігара Колба. Тыя, хто аддае перавагу опернаму мастацтву, атрымаюць асалоду ад «Іаланты» ў пастаноўцы галоўнага рэжысёра Ганны Маторнай. (Усе ж памятаюць знакаміты оперны хіт «Кто может сравниться с Матильдой моей» — дык вось гэта з «Іаланты».)

А яшчэ публіку чакаюць канцэрты ў раскошнай тэатральнай зале. Вось толькі два з іх. «Тэнары. Tribute» — вядучыя салісты тэатра выконваць найвядомейшыя оперныя арыі і неапалітанскія песні. «Как много девушек хороших» — зоркі беларускай оперы выканаюць песні 1930—1940-х гадоў. А завершыцца фестываль Вялікага тэатра ў Нясвіжы традыцыйна гала-канцэртам, які ў якасці рэжысёра рыхтуе прыма беларускай оперы Аксана Волкава.



**Ксенія КАВАЛЕЎСКАЯ, фота аўтара.**

Мама, пачытай!

# НЕЗВЫЧАЙНЫ ТРАФЕЙ

**Вожык Абрыкосік рос у самай звычайнай сям'і лясных вожыкаў. Да таго часу мода на традыцыйныя імёны ў лесе знікала. Усё больш дзеткам давалі найноўшыя імёны — Эмма, Бусінка, Чып, Чуня. Найстарэйшым жыхарам леса — дзядулям і бабулям — яны падаваліся дзіўнымі. Імя Абрыкосік таксама гучала незвычайна. Дагэтуль у лесе нікога не называлі па назвах дрэў ці садавіны — гэта з якога боку паглядзець. Тым не менш імя гэтае ўсім знаёмым вожыкавай сям'і падабалася. Ды і сам Абрыкосік вельмі ганарыўся ім: больш такога сярод яго знаёмых не было. А аднойчы адбыўся выпадак, пасля якога ўсе вырашылі, што Абрыкосік атрымаў такое імя невыпадкова...**

...Як і ўсе вожыкі, бацькі Абрыкосіка любілі збіраць грыбы. Дома на сценах нават віселі фотаздымкі, на якіх галава сям'і, вожык-тата дэманстраваў свае трафеі — вялізныя баравікі, якія яму пашчасціла знайсці ў лесе. Абрыкосік разглядаў фотаздымкі і марыў аб тым, што і яму калі-небудзь пашчасціць знайсці падобныя трафеі.

І вось аднойчы ён з бацькамі выправіўся на ціхае «паляванне», як у сям'і жартам называлі збор грыбоў. Тата толькі па яму вядомых прыкметах накіраваўся да дуба, які рос занадта далёка ад дома. А мама вырашыла далёка не хадзіць, а прайсціся ля дрэў побач з домам. Яна заўсёды прытрымлівалася той думкі, што самае лепшае знаходзіцца побач, толькі мы гэтага не заўважаем.

Абрыкосік жа вырашыў таксама далёка не хадзіць, а пашукаць трафеі непадалёк, толькі ў супрацьлеглым напрамку ад таго месца, куды накіравалася мама.

На жаль, грыбоў на шляху Абрыкосіка не аказалася. У пошуках іх маленькі вожык незаўважна для сябе ўсё больш аддаляўся ад дома. Зусім засмуціўшыся, Абрыкосік хацеў ужо павярнуць назад, як раптам пад адным дрэвам заўважыў невялікі круглы прадмет жаўтаватага колеру, які дагэтуль ніколі не бачыў. Гэта, пэўна, была садавіна, але якая, Абрыкосік не разумеў.

«Што рабіць? Вазьму хоць гэты кругляш», — вырашыў пра сябе вожык, начапіў знаходку на спіну і накіраваўся дадому.

А там яго ўжо чакалі. Малы пачуў, як бацькі яго гукаюць.

Тата, як заўсёды, знайшоў шмат баравікоў. І хоць на гэты раз вялікіх сярод іх не было, ён усё роўна быў вельмі задаволены. Мама назбірала лісічак і крыху маслятаў.

— А я знайшоў нешта незвычайнае! — пахваліўся малы.

Бацькі доўга разглядалі трафей сына, пакуль не прыйшлі да высновы, што гэта абрыкос. Толькі адкуль ён тут? Здавалася, у лесе абрыкосы не раслі, а магчыма, ніхто іх дагэтуль не заўважаў.

Белыя грыбы засушылі, каб зімой варыць грыбны суп, лісічкі пасмажылі, масляты закаталі. А з абрыкоса зрабілі начынку да пірага, які ўсім траім прыйшоўся даспадобы.

— Наступны раз мы назбіраем шмат абрыкосаў і прыгатуем з іх абрыкосавае варэнне, — сказаў тата.

— А яно такое ж смачнае, як і абрыкосавы пірог? — пацікавіўся малы.

— Яшчэ смачней! — адказала мама.

Засынаючы, Абрыкосік думаў пра абрыкосавае варэнне, стараўся ўявіць, якое яно на смак. Дагэтуль ён спрабаваў толькі малінавае, якім частаваў яго сябар медзведзяня. Абрыкосавае варэнне павінна быць нашмат смачнейшае, вырашыў малы і заснуў. Яму сніўся абрыкосавы сад.

**Андрэй СІДАРЭЙКА.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ

## БУЛЬБЯНЫЯ РУЛЕЦІКІ З МЯСАМ



*__Спатрэбіцца:__ бульба — 500—600 г, яйка сырое — 1 шт., мука пшанічная — 100—150 г, фарш змяшаны — 500 г, алей для смажання.*

Бульбу адварыць у «мундзіры», астудзіць, пачысціць. Надзерці на буйнай тарцы. Дадаць соль, перац, яйка, муку. У фарш дадаць соль, перац, спецыі, а таксама халодную ваду ці кефір або смятану для сакавітасці. Цеста раскатаць у каўбаску і нарэзаць на кавалачкі. На аладку выкладваем такім жа пластом фарш, пакідаючы з аднаго боку 1-1,5 см свабоднымі. Аладку з фаршам закручваем шчыльна ў рулецік, свабодны бок цеста прыціскаем. Абсмажваем рулецікі на патэльні з алеем з двух бакоў да зарумяньвання. Рулецікі ўкладваем у форму для выпечкі і ставім у духоўку на 15—20 хвілін пры тэмпературы 200 °С. Хвілін за пяць да заканчэння гатавання можна пасыпаць дзёртым сырам.



СЕЗОН НАРЫХТОВАК

## МЯТНЫ ЦУКАР

***Спатрэбіцца:** цукар — 1 шклянка, мята — дзве жмені.*

Ад галінак мяты адарваць лісцікі, вымыць, абсушыць (нам патрэбна толькі лісце). Адправіць у блендар мяту і цукар. Здрабніць (не да фанатызму). Спыніцеся, як толькі мята аб'яднаецца з цукрам. Атрымаецца кашападобная маса. Выкласці на паднос або бляху і раўнамерна размеркаваць — максімальна тонка. Гэтая маса высыхае пры пакаёвай тэмпературы прыкладна за 12 гадзін. Трэба час ад часу змешваць відэльцам. Пракатаць сухі цукар качалкай, каб разбіць буйныя камячкі. Захоўваць у слоіку са шчыльным вечкам.



**Нюансы**

*Пра выкарыстанне: прысыпаць любыя ягады, з клубніцамі — вельмі ўдалае спалучэнне.*

*Можна выкарыстоўваць для ўпрыгожвання чаго заўгодна — такая дробка фісташкавага колеру дадасць разыначку, здзівіць і заінтрыгуе.*

*Пра сушку: часу можа сысці больш, калі дома вільготна і прахалодна. Тады ёсць сэнс падумаць пра духоўку на вельмі-вельмі нізкай тэмпературы і з прыадчыненай дзверцай.*

УМЕЛЫЯ РУЧКІ

## ПЛЕД З ХУСТАК



**Годнае прымяненне старых хустак і шаляў**

*Калі вы доўгі час захоўвалі старыя хусткі, шалі, паланціны і іншыя аксесуары і ніяк не вырашаліся іх выкінуць, то гэтая ідэя для вас. Непатрэбныя рэчы можна ператварыць у вельмі арыгінальны плед, у які будзе так прыемна загарнуцца.*

*__Спатрэбяцца:__ шалікі, хусткі, паланціны з шыфону, кашміру, мусліну і любых іншых тканін.*

Не страшна, калі на тканінах будуць дзірачкі ці іншыя дэфекты.

Размясціце хусткі і паланціны на стале, складаючы іх адзін на другі, ствараючы шматслаёвую канструкцыю. Падчас работы матэрыял можна рэзаць на кавалачкі неабходнай формы і памеру: галоўнае — сачыць за тым, каб у выніку таўшчыня канструкцыі была аднолькавай па ўсёй плошчы нарыхтоўкі.

Скаліце ўсе пласты паміж сабой.

У якасці асновы будзе выкарыстаны прыдатны па памеры кавалак муслін. Размясціце яго зверху на шматслаёвай канструкцыі і яшчэ раз скаліце ўсе пласты.



Сшывайце пласты паміж сабой на швейнай машыне паралельнымі радкамі, прыкладваючы іх на адлегласці прыкладна 1,5 см.

Цяпер пачынаецца самы адказны этап работы: з дапамогай нажніц з не вострымі кончыкамі неабходна разразаць усе пласты, за выключэннем апошняга.

Пасля таго як усе пласты будуць падрэзаны, падраўняйце нарыхтоўку па краі, надаючы ёй прамавугольную форму.

Памыйце нарыхтоўку ў пральнай машыне, змясціўшы ў спецыяльны мяшок для мыцця. Высушыце і выдаліце вытрапаныя ніткі.

Па перыметры нарыхтоўкі на адлегласці прыкладна 1,5 см ад краю зрабіце радок, які фіксуе выраб.

Цудоўны плед выглядае вельмі эфектна і арыгінальна — годная ідэя па выкарыстанні старых рэчаў.

*КАЛІ ЛЮБІШ, ТО ЖАНІСЯ, А НЕ ЛЮБІШ — АДЧАПІСЯ! (БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ ПРЫМАЎКА).*

# Самая вялікая ўзнагарода

**У калектыве Ашмянскага ўчастка паштовай сувязі Смаргонскага РВПС налічваецца каля 60 чалавек. Яны абслугоўваюць насельніцтва горада і раёна колькасцю 30 тысяч. У складзе УПС — адно гарадское, адно перасоўнае і 14 стацыянарных мясцовых аддзяленняў. Аб тым, як у раёне ўдаецца забяспечыць неабходную якасць аказання паштовых паслуг, карэспандэнту «Звязды» расказала начальнік Ашмянскага УПС Лілія СЯРГЕЙ.**



Па словах Ліліі Станіславаўны, у Ашмянскім раёне налічваецца 286 населеных пунктаў, і супрацоўнікам мясцовага УПС трэба дайсці да кожнага жыхара. Сярод новаўвядзенняў, якія павінны аблегчыць працу паштальёнаў, — увядзенне мабільнага паштальёна. Цяпер не трэба марнаваць час, каб выпісваць шматлікія квітанцыі пры выдачы пенсій, афармленні падпіскі на часопісы і газеты, аплаце жыллёва-камунальных паслуг.

Абнаўляюцца і паштовыя аддзяленні. Напрыклад, два гады назад быў выкананы рамонт у АПС № 3 г. Ашмяны, заменена мэбля, у аддзяленні створана гандлёвая секцыя, дзе прадстаўлены шырокі асартымент тавараў паўсядзённага попыту, як харчовых, так і гаспадарчых. Гэту секцыю з задавальненнем наведваюць шматлікія жыхары райцэнтра.

Ёсць у дадзеным аддзяленні і пункт абслугоўвання карпаратыўных кліентаў — юрыдычных асоб. Ім цяпер не трэба ісці ў адным патоку з фізічнымі асобамі, каб адправіць бандэроль альбо карэспандэнцыю. І там ніколі не бывае чэргаў. Што датычыцца агульнай аператыўнай залы, то там працуе электронная чарга, што вельмі зручна для наведвальнікаў паштовага аддзялення.

— Не было ніводнага выпадку, калі б мы не наведалі кожны населены пункт раёна, — падкрэсліла начальнік Ашмянскага УПС. — Штодзень з раніцы наш аўтатранспарт накіроўваецца ва ўсе вёскі, дзе супрацоўнікаў пошты з нецярпеннем чакаюць іх жыхары. Кожны вясковец можа пакінуць заяўку начальніку паштовага аддзялення, якое абслугоўвае дадзены населены пункт, і гэта заяўка будзе своечасова выканана. Прычым дастаўляецца не толькі карэспандэнцыя, але і шырокі спектр спажывецкіх тавараў, неабходных мясцовым жыхарам. Хачу адзначыць, што тавараабарот па нашым паштовым участку за апошні час склаўся вельмі добры. У асноўным заяўкі ад вясковага насельніцтва паступаюць на тавары харчовай групы. Мы наладзілі цеснае супрацоўніцтва з раённымі вытворцамі харчовых тавараў, такімі, напрыклад, як крухмальны завод, Ашмянскі мясакамбінат, сыраробны завод. І таму маем магчымасць пастаўляць кліентам свежую апетытную прадукцыю.

Сярод найлепшых супрацоўнікаў, узнагароджаных нядаўна ганаровымі граматамі, Лілія Сяргей адзначыла паштальёна АПС «Кальчуны» Наталлю Бізукойць і паштальёна АПС № 3 г. Ашмяны Валянціну Суравец. А спецыяліст па паштовай дзейнасці Дар'я Казакевіч уваходзіла ў склад абласной каманды на рэспубліканскім конкурсе прафесійнага майстэрства.

У калектыве ёсць сапраўдныя самабытныя таленты. Напрыклад, начальнік АПС «Гродзі» Марына Заянчкоўская вырабляе штучныя кветкавыя кампазіцыі, а праграміст прадпрыемства Дзмітрый Некала стварае разнастайныя цудоўныя вырабы. Адзін з такіх вырабаў — шкатулка, як і штучныя кветкі — упрыгожвае працоўны кабінет начальніка УПС.

— Усе намаганні нашага працоўнага калектыву накіраваны на паляпшэнне якасці абслугоўвання людзей, — адзначыла Лілія Станіславаўна. — Мне прыемна, што жыхары Ашмянскага раёна гэта заўважылі і шануюць нашых работнікаў. Паверце, для мяне самая вялікая ўзнагарода — пачуць добрыя словы падзякі за нашу працу ад жыхароў горада і вёсак.

# КОЖНЫ ДЗЕНЬ ПАДПІСЧЫКА СТАНОВІЦЦА САПРАЎДНАЙ ПАДЗЕЯЙ

**Так адзначыла ў размове з карэспандэнтам «Звязды» начальнік Чэрвеньскага УПС Аляксандра ТАРАСЁНАК. У такія дні супрацоўнікі ўчастка паштовай сувязі наведваюць многія арганізацыі Чэрвеньскага раёна, такія, напрыклад, як «Белдзяржстрах», Райаграсэрвіс, аддзяленне кругласутачнага знаходжання пажылых людзей, санаторый «Волма». З гэтымі і іншымі арганізацыямі УПС цесна супрацоўнічае ўжо не першы год, там іх заўсёды цёпла сустракаюць.**





Фота з архіва Чэрвеньскага УПС.

Дзень падпісчыка ў Доме-інтэрнаце.

— Абавязкова мы прывозім з сабой падарункі і сувеніры, якія ўручаюцца тым, хто аформіў падпіску. І перыядычныя выданні, каб кожны мог атрымаць аб іх поўнае ўяўленне, — падкрэсліла Аляксандра Мікалаеўна. — Напярэдадні вялікіх свят, напрыклад Новага года, падобныя сустрэчы ператвараюцца ў сапраўдныя шоу. Выкарыстоўваем сцэнічныя касцюмы, ствараем святочную праграму. Ёсць у нас свой Дзед Мароз, Снягурка. Цёпла вітаем нашых сяброў. Усё гэта вельмі падабаецца людзям, і нас заўсёды чакаюць з нецярпеннем. Як правіла, у падобных мерапрыемствах бяруць удзел прадстаўнікі розных выданняў: пачынаючы ад рэспубліканскіх і абавязкова нашай газеты «Раённы веснік». У ліку выдатных сяброў — выкладчыкі і вучні 4-й чэрвеньскай школы. З імі мы таксама праводзім рэгулярныя сустрэчы. Напрыклад, у кастрычніку на Сусветны дзень пошты сярод навучэнцаў праводзілася віктарына, прысвечаная прафесійнаму святу. Дарэчы, юныя сябры не толькі запрашаюць нас да сябе, але і наведваюцца на ўчастак паштовай сувязі. Мы прапануем хлопчыкам і дзяўчынкам удзельнічаць у акцыях, якія праводзіць РУП «Белпошта». У прыватнасці, накіраваць паштоўку родным, сябрам і знаёмым. Рассылка ажыццяўляецца на бясплатнай аснове. Дзеці з задавальненнем бяруць удзел у падобных акцыях, а мы са свайго боку ўручаем ім невялічкія падарункі.

Па словах Аляксандры Мікалаеўны, найбольшай папулярнасцю ў дзяцей карыстаюцца акцыі «Накіруй ліст Дзеду Марозу», а таксама віншаванні родных і блізкіх. Прычым падобную дзейнасць супрацоўнікі Чэрвеньскага УПС распаўсюдзілі па ўсіх сярэдніх навучальных установах раёна. Усяго па раёне ад школьнікаў было накіравана некалькі соцень акцыйных паштовак.

Падобныя мерапрыемствы Чэрвеньскі УПС праводзіць практычна кожны месяц. А бывае, што і часцей. І кожнае з іх пашырае кола сяброў беларускай пошты.

Значную падтрымку работнікам участка сувязі аказвае раённы аддзел па адукацыі, спорце і турызме.

— Напярэдадні летняй падпісной кампаніі быў створаны чарговы план мерапрыемстваў па арганізацыі дзён падпісчыка на прадпрыемствах і ва ўстановах раёна, — працягвае Аляксандра Тарасёнак. — Абавязкова наведаем усіх нашых партнёраў, якія дапамагаюць нам у арганізацыі падпіскі на перыядычныя выданні. Агульнымі намаганнямі будзем павялічваць колькасць падпісаных экзэмпляраў газет і часопісаў. Працягваецца агульная супрацоўніцтва з установамі адукацыі раёна: сённяшнія вучні — нашы будучыя падпісчыкі. Вельмі важна з юных гадоў прывіць хлопчыкам і дзяўчынкам любоў да сучаснай перыёдыкі.

# САКРЭТ ПОСПЕХУ — ДОБРАЗЫЧЛІВАСЦЬ

**Як адзначыла начальнік Астравецкага УПС Яўгенія ГАЙДУКЕВІЧ, з дня адкрыцця ў маі 2023 года мясцовы паштамаркет паступова павышае гандлёвы абарот арганізацыі.**



— У нашым УПС паштамаркет пачаў дзейнічаць з мая мінулага года, — расказала Яўгенія Станіславаўна. — Вылучылі асобнае памяшканне, размясцілі там халадзільнае і іншае абсталяванне і пачалі гандляваць. У нас людзі могуць набыць як харчовыя (мясныя паўфабрыкаты, малочку, разнастайныя кансервы), так і гаспадарчыя тавары. Попытам карыстаюцца дыванныя вырабы, падушкі і коўдры. І самае прыемнае, што жыхары Астраўца ідуць актыўна. Для нас гэта стала вельмі прыемным сюрпрызам.

Па словах начальніка Астравецкага УПС, многія пакупнікі адзначалі якасць нашых тавараў, свежасць прадуктаў. І гэта нядзіўна: тыя ж харчовыя тавары дастаўляюцца напрамую ад вытворцаў — такіх вядомых у краіне прадпрыемстваў, як Віцебская бройлерная фабрыка «Ганна», Ашмянскія сыраробны завод і мясакамбінат і іншыя.

У памяшканні паштамаркета нядаўна быў выкананы рамонт. Устаноўлены новыя вітрыны і стэлажы. Усё зраблена для таго, каб у гандлёвай зале кожнаму пакупніку было прыемна і зручна набываць тавары. Ну а добры настрой наведвальнікам стварае спецыяліст па паштовай дзейнасці Тэрэса Лукашэвіч, якая з'яўляецца сапраўднай гаспадыняй гандлёвай залы.

— Не здзіўляйцеся, — працягвае Яўгенія Станіславаўна. — У паштамаркеце ў нас працуе ўсяго адзін супрацоўнік. Тэрэса Іосіфаўна цудоўна выконвае свае службовыя абавязкі. Яна — адна з нашых найстарэйшых работніц. Заўсёды з усмешкай, добразычлівая і спагадная. Добрае слова знойдзе для кожнага пакупніка. Пра такіх гавораць, што чалавек — на сваім месцы. Карыстаецца вялікай павагай не толькі ў калег, але і ў шматлікіх наведвальнікаў паштовага аддзялення. У тым, што людзі наведваюць паштамаркет даволі ахвотна, безумоўна, ёсць і яе вялікая заслуга.



Тэрэса ЛУКАШЭВІЧ цёпла сустракае кожнага наведвальніка паштамаркета.

Матэрыялы паласы падрыхтаваў Сяргей РУЧАНАЎ.

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

### информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Гродногазстройизоляция»

**Аукцион состоится 28.06.2024 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | **ЛОТ 1:** грузовой седельный тягач MAZ 6422A8, допустимая полная масса 24500 кг, свидетельство о регистрации САА 252392, дата выдачи 24.03.2010, рег. знак АА 6830-4, номер кузова (рамы) Y3M6422A880000371, 2008 года выпуска, пробег автомобиля составляет 640298 км. Местонахождение автомобиля: Гродненская область, Дятловский район, г.п. Новоельня, ул. Заводская, 7 |
| **Начальная цена продажи** | **ЛОТ № 1** – 26 760 руб. (двадцать шесть тысяч семьсот шестьдесят рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | **ЛОТ № 1** – 2 676 руб. (две тысячи шестьсот семьдесят шесть рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник–четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 26 июня 2024 г. до 15.00** |

Условия проведения аукциона:
1. Возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи.
2. Возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на оказание услуг по независимой оценке объекта продажи в размере 249,78 руб. с НДС за оценку 1 единицы техники

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony

## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**КАПЛАНЕЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: Минская область, Березинский район, д. Мостище, ул. Боровая, д. 2 (адрес указан согласно похозяйственной книге), имеющий основания для признания его пустующим.**

**Сведения о жилом доме (из акта):**

Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 5 х 6 м.

Площадь: 34,0 кв. м.

